Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КРАСАВІКА 2017 г. ЧАЦВЕР № 70 (28434)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Сын франтавіка шукае нямецкіх мастакоў**

СТАР. 5



**Настрой падніме... доктар**

СТАР. 12

Сямейная газета



**Паска: старажытнае ў сучаснасці**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марыяна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, старшыня Беларускага саюза жанчын:**

*«Наша дзяржава робіць усё неабходнае, каб дзеці ні ў чым не мелі патрэбы, раслі ў годных умовах. Усебаковая абарона дзяцей, незалежна ад таго, дзе яны нарадзіліся і хто іх бацькі, заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ўлад, з'яўляецца першарадная задачай дзяржавы. Асаблівая ўвага — маці, якія воляй лёсу апынуліся ў месцах пазбаўлення волі. Ім у будучыні варта больш узважана ставіцца да прыняцця рашэнняў, бо менавіта яны нясуць адказнасць за сваіх малых. Толькі яны ў сілах зрабіць так, каб іх дзеці былі шчаслівымі, выраслі ў любові, атрымалі адукацыю, знайшлі сябе ў жыцці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8912 | ▼ |
| Еўра | 2,0080 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0704 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ЗАРАДКУ СТАНАВІСЯ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню. Напачатку было слова

## ДУХОЎНЫ ЗАПАВЕТ ЧАЛАВЕЧАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

**Міністр інфармацыі Лілія Ананіч — аб дзяржаўным узроўні і міжнародным значэнні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і аб пераемнасці ў выдавецкай справе**

**Другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання стала пляцоўкай для разгляду тэмы 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, для размовы ўвогуле пра сучасны стан кнігадрукавання. З дакладам па гэтай тэме выступіла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава, з судакладамі — міністр інфармацыі Лілія Ананіч і член-карэспандэнт НАН, доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Каваленя. У сваім выступленні міністр інфармацыі Лілія Ананіч звярнула асаблівую ўвагу як на гістарычны складальнік тэмы, так і на сённяшні стан у развіцці кнігавыдання ў краіне. З пытаннямі на тэму 500-годдзя беларускага кнігадрукавання мы і звярнуліся да Ліліі Ананіч.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Лілія Станіславаўна, відаць, упершыню на такім высокім узроўні разглядаліся пытанні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання...***

— Безумоўна, разгляд у Савеце Рэспублікі тэмы 500-годдзя беларускага кнігадрукавання сведчыць пра вялікі клопат дзяржавы аб умацаванні духоўнасці беларускага грамадства. І ў мяне была магчымасць выказаць словы падзякі ад усёй галіны Савету Рэспублікі за ўнясенне ў парадак дня сесіі такога надзвычайнага пытання. Дарэчы, адным са складальнікаў разгляду стала і дэманстрацыя кніжнай выстаўкі і экспазіцыі «Друкарскі двор XVI стагоддзя». На пасяджэнні другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у шэрагу іншых разглядалася пытанне «Аб нарматыўна-прававым рэгуляванні выдавецкай дзейнасці, святкаванні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і мерапрыемствах, прымеркаваных да Года навукі». Атрымаўся грунтоўны разгляд.

СТАР. 5

■ На парозе дарослага жыцця

## РАЗМЕРКАВАННЕ... ГЭТА НЕ СТРАШНА

### У БДПУ забяспечваюць індывідуальны падыход да кожнага выпускніка

**Футуролагі сцвярджаюць, што ў сярэдзіне бягучага стагоддзя ў тройку самых запатрабаваных прафесій увойдуць тры: спецыяліст у сферы IT, урач і педагог. Таму шанцы застацца без працы ў настаўнікаў — мінімальныя. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова завітаць у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, дзе гэтымі днямі праходзіць размеркаванне выпускнікоў. На фоне іншых ВНУ, дзе ў сувязі з двайным выпускам спецыялістаў склалася няпростая сітуацыя з забеспячэннем усіх выпускнікоў першым працоўным месцам, у галоўным педагагічным універсітэце напружання не адчуваецца.**

### Першыя настаўнікі з «асаблівага» факультэта



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Учора тут размяркоўваліся студэнты трох факультэтаў: пачатковай адукацыі, філалагічнага і факультэта эстэтычнага выхавання. Ва ўсе папярэднія гады самы высокі попыт з боку заказчыкаў кадраў быў на настаўнікаў пачатковых класаў і выхавальнікаў дашкольных устаноў. У сталіцы апошнімі гадамі асабліва адчуваўся дэфіцыт адпаведных спецыялістаў.

У бягучым годзе для 66 выпускнікоў факультэта пачатковай адукацыі было 86 планавых месцаў плюс ва ўніверсітэт паступіла 50 дадатковых заявак. Каб пераканацца, што іх патэнцыйныя кадры ніхто не пераманіць, на размеркаванні прысутнічаюць і дырэктары некаторых школ.

СТАР. 8

# Ад прадпрымальнікаў і зацікаўленых чакаюць прапаноў

## Пакет нарматыўных прававых актаў аб спрашчэнні ўмоў вядзення бізнесу вынесены на грамадскае абмеркаванне

**У аўторак падчас сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Рэчыцадрэў», Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка паабяцаў: у найбліжэйшы час у Беларусі будуць прыняты кардынальныя рашэнні па разнявoленні бізнесу. Прэзідэнт адзначыў, што ў найбліжэйшы час адпаведны нарматыўна-прававы акт, які датычыцца прадпрымальніцкай дзейнасці, ляжа яму на стол: «Мы поўнасцю разняволім бізнес-ініцыятыву — ідзіце займайцеся справай, зарабляйце. Мы стварылі для гэтага ўмовы. А што не стварылі — створым у найбліжэйшы час».**

Нагадаем, што ў студзені на падставе распараджэння Прэзідэнта была спецыяльна створана рабочая група па стымуляванні дзелавой актыўнасці, выключэнні залішніх патрабаванняў да суб'ектаў гаспадарання, удасканаленні кантрольна-наглядная дзейнасці, якую ўзначальвае кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава. Была праведзена сістэмная і маштабная работа — ад аналізу матэрыялаў судовай, пракурорскай і адвакацкай практыкі да асабістых зносін з дырэктарамі і іншымі работнікамі прадпрыемстваў. Супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, падпарадкаваных ёй цэнтраў і Міністэрства юстыцыі наведалі больш за 100 прадпрыемстваў рознага профілю дзейнасці ва ўсіх рэгіёнах краіны. З дапамогай Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала быў арганізаваны збор прапаноў грамадзян, прадстаўнікоў бізнесу і юрыстаў-практыкаў — такіх прапаноў паступіла больш за 200. Значная колькасць праблемных пытанняў выяўлена ў ходзе разгляду зваротаў грамадзян і суб'ектаў гаспадарання, якія паступілі ў Адміністрацыю Прэзідэнта, а таксама аналізу публікацый, размешчаных у друкаваных і электронных СМІ. Вывучаўся таксама вопыт замежных дзяржаў па рэгуляванні эканамічнай дзейнасці, у першую чаргу суседніх дзяржаў (Літвы, Польшчы і Эстоніі), у якіх, на думку прадпрымальнікаў, бізнес-клімат найбольш спрыяльны для ажыццяўлення ўсіх відаў эканамічнай дзейнасці.

Атрыманыя такім чынам матэрыялы ўважліва вывучаны спецыяльна сфарміраванымі 12 тэматычнымі падгрупамі па розных напрамках дзейнасці суб'ектаў гаспадарання. У выніку праведзенай работы быў падрыхтаваны камплект дакументаў, накіраваны на «разняволенне» бізнесу і развіццё дзелавой ініцыятывы.

### МЕРКАВАННЕ

**Уладзімір КАЛТОВІЧ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

— Вынясенне праектаў дакументаў на грамадскае абмеркаванне — апраўданы і вельмі правільны крок. Абмеркаванне прадугледжвае не толькі ўдзел, але і некаторую тэарэтычную падрыхтоўку ўсіх, хто хоча заняцца і займаецца бізнесам. Гэта ўверцюра да працы, якая будзе пасля прыняцця дакументаў. Чым больш мы атрымаем разумных прапаноў, тым больш узважанымі і рэальнымі будуць дакументы і тым большую карысць мы атрымаем ад іх укаранення. Стварэнне рабочай групы, якую ўзначальвае кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, было як ніколі своечасовым. Удалы сінтэз спецыялістаў з дзяржструктур і бізнесу дазволіў, па-мойму, стварыць узважаныя і пісьменныя дакументы, якія адлюстроўваюць рэальную патрэбнасць бізнесу ў больш спрыяльных умовах для развіцця.

Учора пакет гэтых нарматыўных прававых актаў аб спрашчэнні ўмоў вядзення бізнесу ў Беларусі вынесены на грамадскае абмеркаванне.

Пакет уключае ў сябе праекты дэкрэта і некалькіх указаў. Як растлумачыў журналістам **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МІЦКЕВІЧ**, асноўныя змены ў дэкрэце маюць на ўвазе спрашчэнне працэдуры адкрыцця бізнесу і вядзення сваёй справы. Напрыклад, каб адкрыць кафэ, прадпрымальніку будзе дастаткова паведаміць пра гэта ў мясцовыя органы ўлады. Пры гэтым бізнесмен гарантуе, што будзе выконваць усе неабходныя патрабаванні. А іх пералік прапануецца мінімізаваць — такую задачу паставіў кіраўнік дзяржавы.

Валерый Міцкевіч расказаў, што ў прапанаваных для грамадскага абмеркавання дакументах прадугледжана, што «ўсе пажарныя, санітарныя правілы, якія дзейнічаюць цяпер, будуць адмененыя, а новыя зацверджаны ў мінімальным варыянце актам кіраўніка дзяржавы». Пералік будзе абмяжоўвацца асноўнымі абавязковымі для выканання патрабаваннямі. Усё астатняе застанецца ў выглядзе рэкамендацый.

Сярод дакументаў ёсць і той, які рэгулюе кантрольна-наглядную дзейнасць. Ім прадугледжваецца істотнае памяншэнне колькасці праверак. У прыватнасці, планавыя наогул будуць адменены. «Застануцца толькі пазапланавыя і строга па вызначаных у дакументце падставах», — сказаў Валерый Міцкевіч. Паводле яго слоў, гэта дазволіць пазбегнуць праверак па надуманых прычынах.

Прапануецца таксама ўвесці ў Беларусі інстытут падатковых кансультантаў, свайго роду пасярэднікаў паміж бізнесам і падатковымі органамі. Гэта павінна пазбавіць бізнес ад неабходнасці ўнікаць ва ўсе тонкасці падаткаабкладання. Задача прадпрымальніка будзе ў тым, каб падаваць падатковым кансультантам правільныя звесткі. «Яны будуць несці адказнасць за паўнату выплаты падаткаў, за іх правільнасць і адказваць, калі нешта не так», — адзначыў Валерый Міцкевіч.

Адначасова са спрашчэннем патрабаванняў, іх канкрэтызацыяй прапануецца ўзмацніць адказнасць уладальнікаў бізнесу за іх выкананне.

Грамадскае абмеркаванне дакументаў будзе праводзіцца на працягу месяца. Усе прапановы будуць разглядацца ў працэсе іх дапрацоўкі. Прэзідэнту будзе прадстаўлены абноўлены варыянт. Ад бізнесу і грамадзян чакаюць канкрэтных прапаноў па разняволенні дзелавой ініцыятывы.

***Грамадзяне і суб'екты гаспадарання могуць азнаёміцца з афіцыйнымі тэкстамі падрыхтаваных дакументаў на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале (http://www.pravo.by/) і пры жаданні накіраваць свае прапановы па іх дапрацоўцы. Для гэтага на партале створана старонка са зваротнай сувяззю, а на Прававым форуме Беларусі (http://forumpravo.by/) — тэма для абмеркавання гэтых дакументаў. Прапановы таксама могуць быць накіраваны напрамую ў тэматычныя падгрупы па адпаведных сферах дзейнасці, якія функцыянуюць на пляцоўках Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь і галіновых міністэрстваў і камітэтаў. Усе заўвагі і прапановы, якія паступаюць у ходзе абмеркавання, будуць разгледжаны на пасяджэннях тэматычных падгруп.***

***Прапановы можна накіроўваць да 12 мая 2017 года.***

# Прэзідэнт накіруецца ў Бішкек

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13—14 красавіка зробіць рабочы візіт у Кыргызскую Рэспубліку, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

У Бішкеку 14 красавіка Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Кіраўнікі дзяржаў плануюць абмеркаваць рэалізацыю асноўных напрамкаў міжнароднай дзейнасці ЕАЭС, асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі дзяржаў — членаў ЕАЭС на наступныя гады. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена эканамічнаму супрацоўніцтву з трэцімі краінамі.

Па выніках пасяджэння чакаецца падпісанне шэрагу міжнародных дакументаў.

У гэты ж дзень Аляксандр Лукашэнка прыме ўдзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ. Прэзідэнты абмяркуюць абстаноўку ў сферы бяспекі, актуальныя выклікі і пагрозы, а таксама шляхі сумеснага процідзеяння ім.

Учора БЕЛТА са спасылкай на прэс-сакратара Прэзідэнта Наталлю Эйсмант паведаміла, што Аляксандр Лукашэнка падпісаў Мытны кодэкс ЕАЭС.

### Тры пытанні да ўлады

# «ГАЛОЎНАЕ НЕ ДЗЕ ПАКАЗВАЦЬ, А ЯК»



**Ваўкавыск сёння з'яўляецца дастаткова буйным рэгіёнам Гродзенскай вобласці, праўда так склалася, што вялікіх спартыўна-забаўляльных устаноў горад не мае. Пра тое, куды сходзіць жыхарам раёна на выхадных і дзе падмацаваць здароўе спортам, ішла гутарка са старшынёй Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Віталем НАВІЦКІМ.**

***— Што сёння можа прапанаваць раённая інфраструктура жыхарам горада для актыўнага адпачынку?***

— Зразумела, што раённы бюджэт не дазваляе сёння ствараць самастойна аб'екты ўзроўню сталічных комплексаў, але і пакінуць праблему наогул райвыканкам не збіраецца. Таму ідзём па прынцыпе «рабіць, што магчыма». Раённы Савет дэпутатаў гэту думку падтрымлівае. Так, у адным з мікрараёнаў горада з'явілася футбольная пляцоўка. Яна размяшчаецца побач са шматпавярховымі дамамі і пабудавана з прыцягненнем сродкаў ад спонсара. Летась на дзень горада была адкрытая «антывандальная» спартыўная пляцоўка. То-бок, такімі, няхай і невялікімі, крокамі ў розных частках горада стараемся ўплываць на сітуацыю.

Што датычыцца блізкіх падзей, то зусім нядаўна быў адкрыты бясплатны зал для заняткаў настольным тэнісам. Адно з прадпрыемстваў горада перадало на баланс раёна сваё памяшканне, а мы ўклалі ў яго сродкі з бюджэту і тое, што ўдалося сабраць падчас суботніка. Можна сказаць, што аб'ект атрымаўся значным для горада, ужо абмяркоўваецца магчымасць правядзення там спаборніцтваў рэспубліканскага ўзроўню, бо ўсім патрабаванням міжнародных стандартаў нашы залы адпавядаюць. Дастаткова многа і задум на будучыню. Напрыклад, падрыхтаваны дакументы на ўключэнне нашага горада ў конкурс, які праводзіць Еўрапейская камісія па трансгранічным супрацоўніцтве. Калі ўсё атрымаецца, у адным з гарадоў Польшчы і ў Ваўкавыску пачнецца будаўніцтва спартыўна-аздараўленчых аб'ектаў. Гэтыя ўстановы будуць у розных краінах, але з люстраным падабенствам адзін да аднаго.

***— Летам у горадзе становіцца больш моладзі: вяртаюцца студэнты, больш вольнага часу ў школьнікаў. Дзе малады чалавек зможа адпачыць у святочны дзень?***

— Летась пасля аднаго з гарадскіх мерапрыемстваў узнікла ідэя праводзіць «Суботні вечар каля фантана». Гэта штотыднёвае мерапрыемства, у добрае надвор'е на плошчы выстаўляем невялікую сцэну, побач размяшчаем гандлёвыя палаткі і такім чынам маем вялікую «кавярню» пад адкрытым небам. Справа ў тым, што пакуль у Ваўкавыску няма буйнога аб'екта грамадскага харчавання, таму ідэю падобных «вечароў» моладзь падтрымала. Карысць відавочная, бо людзям ёсць куды схадзіць, і там жа адначасова яны даведваюцца пра мясцовых артыстаў. Напрыклад, пасля першага выступлення раённых калектываў у мяне нават пыталіся, адкуль запрасілі музыкаў.

Зноў жа з нядаўняга — на баланс горада перададзены Дом культуры чыгуначнікаў. Было вырашана, што гэты будынак прыстасуем пад маладзёжны цэнтр, на адно толькі святло-гукавое абсталяванне раён выдзеліў каля 25 тысяч рублёў. Аднак толькі дыскатэку рабіць не хочацца. Ёсць планы, што ў будучым там можна будзе не толькі патанцаваць, але і выпіць кавы, пагаварыць з сябрамі ў спрыяльнай абстаноўцы, адным словам, як прынята казаць у маладзёжным асяродку, «патусавацца».

***— Вострай праблемай застаецца сыход людзей з вёскі ў гарады. Сельскія клубы зачыняюцца, а жыхары вымушаны ехаць у цэнтр дзеля культурнага адпачынку. Наколькі апраўдана работа падобных устаноў на вёсцы?***

— Асноўнае пытанне не «дзе знаходзіцца ўстанова?», а «што там арганізуецца?» Бывае, у сельскі клуб з'язджаецца моладзь з суседніх пасёлкаў, а часам і з раённых і нават абласных цэнтраў. На вёсцы ёсць прадпрыемствы, і жыхарам, якія там працуюць, у святочны дзень хочацца бачыць культурную праграму. Безумоўна, ладзіць вялікую работу з прыцягненнем сродкаў, дарагой апаратуры мэтазгодна не ў кожным населеным пункце. Сёння ўстановы культуры працуюць у кірунку, калі кожны клуб развівае адно з мерапрыемстваў як брэнд мясцовасці. У Плябанаве гэта «Свята лета», у Мачуліне — «Свята кветак», у Вярэйках — «Дзень рыбака»... Хацелася б, каб у будынвны ў раёне ўзнікла некалькі «кропак» сельскага клубнага жыцця са сваёй праграмай і цікавымі момантамі. Моладзь цяпер вельмі мабільная, дарогі і транспарт ёсць, значыць, не ўзнікне праблемы ў тым, каб прыехаць на мерапрыемства ў іншым пасёлку.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Казахстан мае намер перайсці з кірыліцы на лацінку

**Адпаведнае даручэнне ўраду даў прэзідэнт Нурсултан Назарбаеў.**

«Да канца 2017 года пасля кансультацый з вучонымі і прадстаўнікамі грамадскасці павінен быць распрацаваны адзіны стандарт новага алфавіта і графікі на лацініцы. З 2018 года трэба рыхтаваць спецыялістаў для навучання і выпускаць падручнікі для сярэдняй школы. У найбліжэйшыя два гады трэба правесці ўсю арганізацыйную і метадычную работу», — адзначыў Назарбаеў.

Ён дадаў, што цалкам адмовіцца ад кірыліцы Казахстан павінен да 2025 года. «Гэты тэрмін назіраецца, і мы, не губляючы часу, павінны ўзяцца за гэтую работу», — заклікаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, новы алфавіт дазволіць больш эфектыўна мадэрнізаваць грамадства, палегчыць камунікацыю са знешнім светам, дапаможа дзецям хутчэй вывучаць англійскую мову.

### Махмуд Ахмадзінежад зарэгістраваўся ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Ірана

Раней былы кіраўнік выканаўчай улады краіны заяўляў, што ўдзельнічаць у прэзідэнцкай гонцы не будзе.

Былы Прэзідэнт Ірана Махмуд Ахмадзінежад, які ўзначальваў выканаўчую ўладу краіны ў 2005—2013 гадах, зарэгістраваўся ў якасці кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах. Пра гэта паведамляе іранскае агенцтва ISNA. У аўторак у МУС IPI пачалася рэгістрацыя кандыдатаў для ўдзелу ў прэзідэнцкіх выбарах, якія маюць адбыцца 19 мая. Паводле канстытуцыі Ісламскай Рэспублікі Іран, прэзідэнтам краіны можа стаць любы карэнны жыхар краіны не маладзейшы за 40 гадоў, які з'яўляецца актыўным прыхільнікам ісламу і ісламскага ладу. Заяўкі будуць прымацца на працягу пяці дзён, і ўжо ў першы зарэгістраваліся больш за 100 чалавек. Такая масавасць адзначаецца кожныя чатыры гады — перад выбарамі набіраецца некалькі сотняў, а то і пад тысячу ахвотных стаць прэзідэнтам.



У сярэдзіне мінулага года Ахмадзінежад казаў аб планах выставіць сваю кандыдатуру, аднак кіраўнік і духоўны лідар Ісламскай Рэспублікі Іран аятала Алі Хаменеі палічыў гэтыя планы «неразумнымі і неметазгоднымі».

### Kyodo: ЗША нанясуць удар па КНДР, калі Кітай не акажа на Пхеньян рэальнага націску

Прадстаўнік Дзяржддэпартамента ЗША паведаміў японскаму ўраду, што ёсць толькі два варыянты — або Пекін узмацняе ціск на свайго саюзніка, або ЗША наносяць удар.

Як паведамляе інфармацыйнае агенцтва Kyodo, прадстаўнік Дзярждэпа даваў такую пазіцыю да японскага ўрада ў пачатку красавіка.

Ва ўрадзе Японіі пасля гэтага, піша Kyodo, цалкам усвядомілі, што ваенная аперацыя ў дачыненні да КНДР стала для ЗША рэальным выбарам. У Токіа ў сувязі з гэтым выказваюць заклапочанасць тым, што Японія і Паўднёвая Карэя могуць стаць мішэнямі ўдараў у адказ з боку Пхеньяна, адзначае агенцтва.

## ■ Добраўпарадкаванне

# ВЯСНОВЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ

### Якія змены чакаюць сталіцу ў новым сезоне?

**Наступленне цёплай пары года традыцыйна адзначана масавай работай па навядзенні парадку. Напрыклад, на гэтую вясну ў Мінску запланавана правядзенне рамонтных работ практычна на 500 дваровых тэрыторыях, дзесяць з іх чакае капітальны рамонт, а таксама абнаўленне вонкавага выгляду чатырох тысяч пад'ездаў, праўда, ужо за кошт жыхароў.**

### Мінск як ўвасабленне чысціні і прыгажосці

Як адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Галіна ГІЛЕВІЧ**, не ўсе ініцыятывы атрымліваюць шырокі водгук. Так, спрашчэнне парадку ўстаноўкі шлагбаума не паўплывала на запатрабаванасць гэтай паслугі.

Праводзіцца кантроль і за станам прыватных домаўладанняў. Ужо праверана каля 400 дамоў у трох раёнах сталіцы, па выніках агляду было выпісана 40 прадпісанняў, 80% з якіх ужо выкананы. Праверкі працягваюцца.

Па словах **намесніка старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяны ДУБІК**, з мэтай павышэння экалагічнай адукаванасці насельніцтва плануецца да канца года ўладкаваць экасцежыны ў кожным з раёнаў Мінска. Усе яны будуць са сваёй «скрыпкай»: у Маскоўскім раёне сцежка пройдзе па тэрыторыі былога яблыневага саду, а ў Заводскім — на маршруце будуць змешчаны бабровыя хаткі.

Цяпер у сталіцы праводзіцца акцыя «Мільён дрэў — Мінску». Толькі з 1994 года на тэрыторыі сталіцы было высаджана каля 990 тысяч дрэў. З'яўленне мільённага дрэва-сімвала будзе прымеркавана да Дня Зямлі, яго ўрачыстая высадка адбудзецца 22 красавіка.

Акрамя дрэў сталіцу ўпрыгожаць і два мільёны кветак. **Кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў гарадской гаспадаркі УП «Мінскзеленбуд» Анжаліка ПУЗАНКОВА** паведаміла, што нароўні з традыцыйнымі тэхнікамі і сартамі будзе прымяняцца кантэйнернае і вертыкальнае азеляненне, а каля Палаца спорту хутка распусцяцца «казачныя» сінія цюльпаны, якія раней не былі прадстаўлены ў сталіцы.

Самыя незвычайныя кветкавыя кампазіцыі з'явяцца паблізу гасцініцы «Беларусь». Там можна будзе ўбачыць архітэктурныя сімвалы горада — Нацыянальную бібліятэку, Чырвоны касцёл, кола агляду — выкананыя з кветак.

Дарэчы, само кола агляду, як і іншыя атракцыёны, пачне сваю работу 21 красавіка, сезон работы фантанаў адкрыецца на тыдзень раней. А вось на легендарнай пляцоўцы «Сустрэча» ў парку Чалюскінцаў пакуль ідуць работы па яе рэканструкцыі, але да канца вясны яна ўжо зможа прыняць сваіх пастаянных наведвальнікаў.

Добрыя навіны чакаюць жыхароў Каменнай горкі: размешчаны тут парк імя Уга Чавеса набудзе значна больш уладкаваны выгляд, тут з'явяцца дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі, зона для правядзення масавых мерапрыемстваў умяшчальнасцю да дзвюх тысяч чалавек, гандлёвыя павільёны.

### З дапамогай БРСМ і тых, хто стаіць на біржы працы

Мерапрыемствы па добраўпарадкаванні закранулі таксама зоны адпачынку і пляжныя тэрыторыі. Усяго ў Мінску і Мінскім раёне знаходзіцца 20 пляжаў, якія адносяцца да вадасховішчаў Заслаўскага, Цнянскага, Драздоў і Крыніцы. Цяпер на іх установлена больш за паўтары тысячы адзінак пляжнага абсталявання, у планах на гэты год з'яўленне яшчэ 14 новых альтанак, 12 мангалаў, 9 вулічных трэнажораў, 5 камплектаў лясной мэблі, дзіцячых гарадкоў і іншых неабходных для камфартабельнага адпачынку аб'ектаў.

Як расказаў **дырэктар унітарнага прадпрыемства «Мінская лесапаркавая гаспадарка» Павел БАГДАНЧЫК**, работа па навядзенні парадку ўжо пачалася.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На гэты летні сезон запланавана правядзенне масавых суботнікаў з удзелам БРСМ пад назвай «Чысты пляж». Маладыя людзі будуць раздаваць адпачывальнікам поліэтыленавыя пакеты для прыбірання смецця, а за нядобрасумленнымі гараджанамі будуць прыбіраць самі. Акцыя праводзілася і раней, у дні свят, цяпер жа яна будзе праходзіць кожныя выхадныя.

Зараз жа да сезонных работ прыцягнутыя 20 беспрацоўных. Да канца красавіка яны будуць задзейнічаны ў ачыстцы лесу ад неліквіднага галля і зборы смецця на базе Ждановіцкага лясніцтва.

Падчас акцыі «Тыдзень лесу» ўжо было высаджана ў лесапаркавай зоне сталіцы 50 гектараў лясных культур. Адна з важных задач на гэтую вясну — ачысціць 110 гектараў пашкоджанага лесу ў раёне Сосны, які пацярпеў ад урагану ў мінулым ліпені, і замяніць высечаныя дрэвы новымі. Пасля 1 чэрвеня, калі завершыцца сезон нерасту рыбы, Мінскводаканал будзе праводзіць ачышчальныя работы ў самых вадаёмах.

### Не перасекчы мяжу

Па словах **начальніка аддзела дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, лясоў, жывёльнага і расліннага свету Мінгаркампрыроды Таццяны ШАМЯНКОВАЙ**, самае распаўсюджанае парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства ў зонах адпачынку — гэта стаянка бліжэй чым за 30 метраў ад берагавой лініі, што цягне за сабой адказнасць у выглядзе штрафу памерам да 10 базавых велічынь. Да канца мая будзе ўстаноўлена яшчэ 500 надаўбняў і 90 шлагбаумаў там, дзе стаянка забаронена. Да таго ж у месцах масавага адпачынку ў летні перыяд штодня будуць дзяжурыць супрацоўнікі ДАІ. А вось «фотапасткі» не зусім апраўдалі чаканні: у гэтым сезоне яны будуць мабільнымі і накіраванымі на фіксацыю пераважна аднаго парушэння — паркоўкі ў неналежным месцы.

За апошнія 10 гадоў колькасць мінскіх пляжаў не змянілася, яны ўсё з'яўляюцца бясплатнымі і агульнадаступнымі. Што датычыцца з'яўлення на Мінскім моры закрытага пляжа, то ён не паўстаў на месцы раней існуючага, а быў спецыяльна абсталяваны для гэтых мэт.

Усе пляжы ў сталіцы будуць аснашчаны пунктамі пракату і грамадскага харчавання, якімі не будуць абдзеленыя і раённыя пляжы. Тры пункты на Цнянскім вадасховішчы выстаўлены на аўкцыён, які пройдзе 21 красавіка. Дарэчы, гэта вадасховішча можа пахваліцца адной з найбольш развітых інфраструктур: на трох рэканструяваных пляжах ужо з'явіліся веладарожкі, звязаныя з горадам, у планах — іх падаўжэнне на ўсю зону адпачынку.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## АДЧУЦЬ ДАПАМОГУ

**У суботу, 15 красавіка, пройдуць чарговыя прамыя тэлефонныя лініі. На званкі жыхароў краіны адкажуць кіраўнікі гарадоў, раёнаў і абласцей, разам яны пастараюцца знайсці шляхі выхаду з праблемных сітуацый.**

**З 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

## Інвестар для Мсціслава

Гэты горад, багаты на гістарычныя помнікі, пазалетась атрымаў магчымасць праз праект COMUS знайсці інвестара не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Асноўная мэта праекта — захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў малых гарадоў. У спіс аб'ектаў, якія плануецца аднавіць з дапамогай будучых спонсараў, трапілі кармеліцкі касцёл, ансамбль езуіцкага манастыра, былая мужчынская гімназія, гасцініца Эрмітаж і адзін з будынкаў гандлёвых радоў для візіт-цэнтра, дзе будзе сабрана ўся карысная інфармацыя для турыста. Нядаўна ў Мсціславе прайшоў двухдзённы семінар, на якім спецыяліст Савета Еўропы расказала, як правільна скласці і аформіць тэхнічную дакументацыю, што падкрэсліць, каб праекты прыцягнулі ўвагу.

— Да пачатку лета мы павінны падрыхтаваць пакеты неабходных дакументаў на былую мужчынскую гімназію і адзін з будынкаў езуіцкага комплексу для перадачы іх у Еўрапейскі банк, — паведаміла намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мсціслаўскага райвыканкама Святлана Зубрыновіч. — Вельмі спадзяёмся, што з дапамогай гэтага банка знойдзем неабыякавых да нашай культурнай спадчыны людзей. Нас задаволіць любы варыянт, нават калі будзе ажыццяўляцца рэканструкцыя не ўсяго будынка цалкам, а, напрыклад, нейкай яго часткі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ■ Ну і ну!

# РАБАВАЛІ З ДАПАМОГАЙ КАМП'ЮТАРА

### У Магілёве адбыўся суд над удзельнікамі рэзанансной гісторыі, звязанай з пластыкавымі карткамі

**На лаве падсудных апынуліся 2 фігуранты злачыннай групы — арганізатар і яго саўдзельнік. Яшчэ адзін удзельнік пакуль знаходзіцца ў вышуку. На працягу трох гадоў яны рабавалі грамадзян ЗША, карыстаючыся скрадзенымі данымі іх пластыкавых картак. Усе трое ўваходзілі ў склад транснацыянальнай групы, якая з 2009-га па 2015 год шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі ажыццяўляла несанкцыянаваны доступ да інфармацыі аб банкаўскіх карт-рахунках і рэквізітах банкаўскіх плацежных картак. Следствам і судом было разгледжана каля 700 эпізодаў гэтай крымінальнай справы, сабрана доказаў на 62 тамы. Кастрычніцкі суд Магілёва прысудзіў арганізатара і яго саўдзельніка да 11 гадоў 6 месяцаў і 9 гадоў зняволення адпаведна.**

Абвінавачаныя патрацілі на пакупкі і паслугі ў замежных інтэрнэт-крамах звыш 200 тысяч долараў ЗША, якія належалі замежным грамадзянам. Знятыя злачынным шляхам грошы з эміцыравных банкамі ЗША пластыкавых картак міжнародных аплатных сістэм Visa, MasterCard, American Express паступалі на электронныя кашалькі саўдзельнікаў, потым абналічваліся.

— Кожны ў гэтай злачыннай групе выконваў сваю ролю, — паведаміла **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці, дзяржаўны саветнік юстыцыі 3 класа Алена ШУМЕЙКА**. — Адзін з саўдзельнікаў купляў рэквізіты банкаўскіх картак у хакера з Украіны, а арганізатар каардынаваў дзейнасць злачынцаў з розных краін, у прыватнасці грамадзян ЗША і Расіі. Гэтыя людзі павінны былі атрымаць выкрадзены тавар, затым яго перапрадаць, а працэнт ад «здзелкі» пераводзіць на электронныя кашалькі сістэмы Webmoney. Трэці ўдзельнік непасрэдна займаўся атрыманнем наяўных электронных грошай. Напрыклад, афармляў на нядбайных грамадзян Смаленскай вобласці фіктыўныя фірмы на Кіпры з пераводам на іх рахунак грашовых сродкаў.

Сваімі дзеяннямі злачынцы нанеслі значны ўрон плацежным сістэмам Visa, MasterCard, American Express. Асноўнымі доказамі па справе сталі электронныя носьбіты інфармацыі і аналіз сабраных доказаў. Нягледзячы на адсутнасць шкоды грамадзянам Беларусі і яе фінансавым установам, абвінавачаныя падрывалі аўтарытэт нашай краіны адносна бяспекі электронных плацяжоў.

Прысуд пакуль не ўступіў у законную сілу, і абвінавачаныя маюць магчымасць абскардзіць яго на працягу 10 дзён.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ■ Не прапусціце!

# Надзьмутыя гіганты, букеты і мульцяшкі

**13—15 красавіка ў мінскім Палацы спорту ў межах выстаўкі «БэбіЭкспа» пройдзе фестываль паветраных шароў. Найлепшыя аэрадызайнеры Беларусі і замежжа будуць не толькі спаборнічаць паміж сабой, але і даказваць, што сённяшні звычайны шарык можна выкарыстоўваць як матэрыял для новага віду мастацтва.**



На вачах у гледачоў будуць нараджацца незвычайныя паветраныя скульптуры. Так, канкурсантам давядзецца з шарыкаў ствараць мульцяшных герояў, букеты і іншыя незвычайныя фігуры. Але, бадай, самым цікавым будзе конкурс з гіганцкімі шарамі (дыяметрам у 110 см), якія ўдзельнікі спаборнічаць павінны ператварыць у дзіўных жывёл. За час конкурсу фігура можа прырасці і ў вышыню, і ў даўжыню да трох-чатырох метраў. Гатовых веліканаў (а стварыць іх будуць 13 каманд) плануецца запусціць пад столю Палаца спорту.

Праграма выстаўкі дзіцячых тавараў і паслуг будзе насычана разнастайнымі мерапрыемствамі: ад майстар-класаў па хэнд-мэйдзе і кансультацый па грудным выкормліванні да бясплатнай работы стылістаў над іміджам матуль і бабуль, якія сюды завітаюць. Маленькіх гасцей таксама чакае багата сюрпрызаў, сярод якіх — прэзентацыя шоу-праграмы з паветранымі шарыкамі.

Аказалася, што нават тым пестунам, якім бацькі кожны дзень нараджэння заказваюць розныя праграмы, можна падрыхтаваць нешта навенькае. Гэта можа быць свята, напоўненае шарамі рознага памеру. Дзеці будуць бегаць вакол іх, удзельнічаць з імі ў эстафетах, танцаваць, вучыцца самастойна ствараць з іх разнастайныя цацкі...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.** *dziadziula@zviazda.by*

# ТЕХНОБАНК

**ОАО «Технобанк»**
**220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,**
**Телефон +375 17 283 15 10**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2017 года

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 3.1 | 26 973 | 26 562 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 399 | 393 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 3.2 | 28 887 | 15 749 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 3.3 | 33 535 | 54 096 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3.4 | 121 349 | 42 477 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 3.5 | 235 768 | 135 937 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 54 | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 3.6 | 2 | 2 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3.7 | 27 182 | 26 693 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 3.8 | 3 260 | 1 785 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 3.9 | 180 | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 3.10 | 9 030 | 7 247 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **486 619** | **310 941** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 3.11 | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | 3.12 | 111 800 | 44 194 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 3.13 | 309 648 | 207 128 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 3.14 | 3 194 | 971 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 3.15 | 3 950 | 4 496 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **428 592** | **256 789** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 3.16 | 11 463 | 11 199 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 5 150 | 1 730 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 3.17 | 18 641 | 18 434 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 3.18 | 22 773 | 22 789 |
| **30** | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **58 027** | **54 152** |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **486 619** | **310 941** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2016 год

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 31 154 | 30 192 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 14 968 | 12 602 |
| **3** | **Чистые процентные доходы** | **201** | **4.1** | **16 186** | **17 590** |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 12 189 | 11 287 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 3 394 | 2 355 |
| **6** | **Чистые комиссионные доходы** | **202** | **4.2** | **8 795** | **8 932** |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 4.3 | 37 | 30 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 4.4 | 81 | 707 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4.5 | 11 125 | 11 524 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 4.6 | 62 | (278) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4.7 | 19 965 | 16 875 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4.8 | 17 560 | 7 495 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 4.9 | 28 876 | 24 080 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 4.10 | 1 541 | 1 334 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 3 464 | 3 711 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | (180) | 259 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **3.18** | **3 644** | **3452** |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 9 | 0,0764 руб. | 0,0724 руб. |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2016 ГОД

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Уставный фонд | Эмиссионный доход | Резервный фонд | Накопленная прибыль (убыток) | Фонды переоценки статей баланса | Всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1** | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | Остаток на 01 января 2015 г. | 3011 | 11 200 | - | 1 260 | 19 780 | 18 298 | 50 538 |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | (1) | - | 470 | 3 009 | 136 | 3 614 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 3 452 | 164 | 3 616 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 470 | (470) | X | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | (1) | - | X | (1) | X | (2) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (1) | X | (1) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | (1) | X | X | X | X | (1) |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | 28 | (28) | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - | - |
| 3 | Остаток на 01 января 2016 г. | 3013 | 11 199 | - | 1 730 | 22 789 | 18 434 | 54 152 |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | Остаток на 01 января 2016 г. | 3013 | 11 199 | - | 1 730 | 22 789 | 18 434 | 54 152 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | 264 | - | 3 420 | (16) | 207 | 3 875 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | X | X | X | 3 644 | 231 | 3 875 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | X | 3 420 | (3 420) | X | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | 1 | - | X | (1) | X | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | X | X | X | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | X | X | X | (1) | X | (1) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | 1 | X | X | X | X | 1 |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | 263 | - | - | (239) | (24) | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | 5 | 5 |
| 6 | Остаток на 01 января 2017 г. | 3013 | 11 463 | - | 5 150 | 22 773 | 18 641 | 58 027 |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2016 год

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **Прибыль(убыток)** | **301211** | | **3 644** | **3 452** |
| **2** | **Прочие компоненты совокупного дохода** | **301212** | | **231** | **164** |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | | - | - |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | 231 | 164 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| **3** | **ИТОГО совокупный доход** | **30121** | **5** | **3 875** | **3 616** |

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2016 год

Наименование банка: ОАО «Технобанк» (в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 29 046 | 28 642 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (14 382) | (12 378) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 12 162 | 11 321 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (3 369) | (2 331) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 37 | 30 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 81 | 707 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 12 074 | 10 877 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 8 | (278) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 610 | 1 947 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (24 760) | (20 366) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | - | (315) |
| **13** | **Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого** | **701** | | **11 507** | **17 856** |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (34) | 57 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (6 343) | (9 122) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (61 406) | (19 288) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (104 945) | (10 621) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | (437) |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | 3 280 | 350 |
| **20** | **Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого** | **702** | | **(169 448)** | **(39 061)** |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (395) | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 68 126 | 38 991 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 94 675 | 24 237 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 2 069 | (7 678) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | (124) | (1 185) |
| **27** | **Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого** | **703** | | **164 351** | **54 365** |
| **28** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности** | **70** | **6.1** | **6 410** | **33 160** |
| **29** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (4 272) | (1 982) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 264 | 534 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | 3 |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | (313 778) | (181) |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | 297 352 | - |
| **36** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности** | **71** | **6.1** | **(20 434)** | **(1 626)** |
| **37** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 263 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | (1) |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | (1) | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | - |
| **42** | **Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности** | **72** | **6.1** | **262** | **(1)** |
| **43** | **Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты** | **73** | | **944** | **8 433** |
| **44** | **Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов** | **74** | | **(12 818)** | **39 965** |
| **45** | **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода** | **740** | | **-** | **78 045** |
| **46** | **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода** | **741** | | **65 227** | **-** |

**Председатель Правления** **Д.Л. Михалевич**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

**Дата подписания «27» марта 2017 г.**

**Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта: https://tb.by/about/bank/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.12.2013 г. УНП 100706562

---

BDO

Телефон: +375 17 308 74 51
Факс: + 375 17 308 74 50
www.bdo.by

ООО «БДО»
пр. Победителей, 103
этаж 8, помещение 7
Минск, Беларусь
220020

Исх. номер: 04-03/48/118
Дата: 27 марта 2017 года

**Аудиторское заключение по публикуемой годовой отчетности Открытого акционерного общества «Технобанк» за период с 1 января 2016 год по 31 декабря 2016 года**

Акционерам, Наблюдательному совету и Правлению ОАО «Технобанк»
Национальному банку Республики Беларусь

**Реквизиты аудируемого лица:**
**Наименование: Открытое акционерное общество «Технобанк» (ОАО «Технобанк»)**
**Место нахождения: Республика Беларусь 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44**
**Сведения о государственной регистрации: ОАО «Технобанк» зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 5 августа 1994 года, регистрационный номер 47.**
**УНП 100706562**

**Реквизиты аудиторской организации:**
**Наименование: Общество с ограниченной ответственностью «БДО» (ООО «БДО»)**
**Место нахождения: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, этаж 8, помещение 7**
**Сведения о государственной регистрации: Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом 15.11.2013 года**
**УНП: 190241132.**

Мы провели аудит прилагаемой публикуемой годовой отчетности Открытого акционерного общества «Технобанк» (далее – Банк), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2017 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала и отчета о движении денежных средств за 2016 год.

Прилагаемая публикуемая годовая отчетность, составленная на основании годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Технобанк» за 2016 год, подготовлена с целью ее обязательной публикации, в соответствии с постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 января 2013 года № 19 «Об утверждении инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга».

Аудированная годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность и публикуемая годовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

***Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и публикуемой годовой отчетности***

Руководство Банка несет ответственность за составление и представление годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и прилагаемой публикуемой годовой отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь о бухгалтерском учете и отчетности, а также за организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и публикуемой годовой отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

***Обязанности аудиторской организации***

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности и публикуемой годовой отчетности, основанное на результатах проведенного аудита. Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной публикуемой годовой отчетности.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, а также публикуемой годовой отчетности. Выбор аудиторских процедур проводится на основании профессионального суждения аудитора с учетом оценки риска наличия существенных искажений в годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке таких рисков аудитор рассматривает систему внутреннего контроля, необходимую для составления и представления годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, не содержащей существенных искажений, с целью разработки соответствующих аудиторских процедур, но не с целью выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

***Аудиторское мнение***

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая годовая отчетность, составленная на основании годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Технобанк» достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Технобанк» на 1 января 2017 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения его финансового положения (движение денежных средств) за 2016 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В целях более точного понимания финансового положения ОАО «Технобанк» по состоянию на 1 января 2017 года и результатов его финансово-хозяйственной деятельности за 2016 год публикуемую годовую отчетность следует изучать вместе с полной годовой бухгалтерской (финансовой) отчетностью.

Директор Управляющий партнер BDO в Беларуси — А.Н. Шкодин (квалификационный аттестат аудитора № 0000657 от 10 марта 2003 года, рег. № 650)

Заместитель директора по аудиту финансовых институтов, руководитель проверки — Н.В. Кондратьева (свидетельство о соответствии квалификационным требованиям для осуществления аудиторской деятельности в банковской системе № 29 от 15.03.2006; квалификационный аттестат аудитора № 0001006 от 26.08.2003, рег. № 991)

Дата аудиторского заключения: 26 марта 2017 года
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 26 марта 2017 года

Главный бухгалтер Кузьмицкая Н.А. Подпись________

# ДУХОЎНЫ ЗАПАВЕТ ЧАЛАВЕЧАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Цяпер актыўна працуе арганізацыйны камітэт па святкаванні 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Вы і міністр культуры з'яўляецеся старшынямі камітэта. Праводзіцца досыць шмат мерапрыемстваў. Але ж, зразумела, мерапрыемствы, іх колькасць — не самамэта...***

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 46 | 13 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 46 | 13 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,17 | 0,05 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | Х | Х | Х |
| типа ____________ | рублей | - | - |
| типа ____________ | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,17 | 0,05 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | Х | Х | Х |
| типа ____________ | рублей | - | - |
| типа ____________ | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 2015 | Х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 28.03.2016 | Х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | 29.03-06.04.2016 | Х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 3,60 | 3,43 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, всего | штук | - | - |
| В том числе: поступившие в распоряжение общества: | Х | Х | Х |
| количество акций | штук | - | Х |
| дата зачисления акций на счет «депо» общества | дата | - | Х |
| срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | дата | - | Х |
| приобретенные в целях сокращения общего количества акций: | Х | Х | Х |
| количество акций | штук | - | Х |
| дата зачисления акций на счет «депо» общества | дата | - | Х |

8. Среднесписочная численность работающих (человек) – 4.
9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (наименование и процентное соотношение суммы выручки по каждому из них к общему объему выручки): сдача в наем собственного и арендуемого имущества – 100%.
10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный 2016 год: 28 марта 2017 года.
13. Сведения о применении обществом Свода правил корпоративного поведения: не применяются.
14. Адрес официального сайта общества в глобальной компьютерной сети Интернет: ____________.

Закл. 1/3/13-2017 от 1.03.2017 г. г. Минск

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ (БЕЗ ОГОВОРОК) ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ ОАО «Гастроном «Блеск» с 01.01.2016 по 31.12.2016

**Адресат:** Директору **ОАО «Гастроном «Блеск»** Люблинской Евгении Геннадьевне
**Аудируемое лицо:** Открытое акционерное общество **«Гастроном «Блеск»**
**Местонахождение:** РБ, 220019, г. Минск, ул. Шаранговича, д. 51
**Сведения о государственной регистрации:** Свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации выдано на основании решения Минского городского исполнительного комитета решением № 67 от 21.01.2005 г.
**УНП:** 190374344
**Аудиторская организация (индивидуальный предприниматель):**
Индивидуальный предприниматель Кухаревич Андрей Константинович
**Местонахождение:** 220093, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Пушкина, 85-265
**Сведения о государственной регистрации:**
Свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя № 0300353 от 19 ноября 2010 г., квалификационный аттестат аудитора №0001577 от 29.01.2008, выдан на основании приказа Министерства финансов Республики Беларусь №27.
**УНП:** 191366222
Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности
**ОАО «Гастроном «Блеск»,** состоящей из:
бухгалтерского баланса на 31.12.2016 г.;
отчета о прибылях и убытках; отчета об изменении капитала; отчета о движении денежных средств (с 01.01.2016 г. по 31.12.2016 г.), отчета о использовании полученных средств,
примечания к отчетности.

Руководство **ОАО «Гастроном «Блеск»** несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных **ОАО «Гастроном «Блеск»** финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля **ОАО «Гастроном «Блеск»** с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

В результате проведенного аудита существенных нарушений действующего порядка составления годовой бухгалтерской отчетности и ведения бухгалтерского учета не установлено.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность **ОАО «Гастроном «Блеск»**, подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение **ОАО «Гастроном «Блеск»** на 31 декабря 2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения **ОАО «Гастроном «Блеск»** за год, закончившийся на указанную дату.

Индивидуальный предприниматель А. К. Кухаревич
«1» марта 2017 г.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2016 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «Искра-М» |
| Учетный номер плательщика | 100018385 |
| Вид экономической деятельности | 68200 |
| Организационно-правовая форма | коллективная |
| Орган управления | без ведомственной подчиненности |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220075, г. Минск, ул. Инженерная, 1А |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 г. | На 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 448 | 483 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **448** | **483** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 25 | 34 |
| В том числе: материалы | 211 | 25 | 34 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 81 | 102 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 15 | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **123** | **136** |
| **БАЛАНС** | **300** | **571** | **619** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2016 г. | На 31 декабря 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 37 | 37 |
| Добавочный капитал | 450 | 461 | 469 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 55 | 46 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | -39 | |
| Целевое финансирование | 480 | 39 | 40 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **553** | **592** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 18 | 27 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 12 | 13 |
| по авансам полученным | 632 | 1 | 5 |
| по налогам и сборам | 633 | 3 | 6 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | | 1 |
| по оплате труда | 635 | 1 | 2 |
| прочим кредиторам | 638 | 1 | |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **18** | **27** |
| **БАЛАНС** | **700** | **571** | **619** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь–декабрь 2016 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 года | За январь – декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 59 | 130 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (141) | (200) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | (82) | (70) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | (82) | (70) |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 7 | 28 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (19) | (33) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | (94) | (75) |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 69 | |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 69 | |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | 14 | |
| В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | 14 | |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 – 110 + 120 – 130) | 140 | 55 | |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | (39) | (75) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | (39) | (75) |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | (39) | (75) |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию, руб. | 250 | (0,23) | (0,45) |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, руб. | 260 | (0,23) | (0,45) |

Руководитель А.И. Кравчук
Главный бухгалтер С.А. Коровицкий
01 марта 2017 г.

### Выписка из аудиторского заключения от 01.03.2017

Бухгалтерская отчетность ОАО «Искра-М», подготовленная в соответствии с требованиями законодательства РБ, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Искра-М» на 31 декабря 2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ОАО «Искра-М» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства РБ.

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс**

## «ОЛИМПИЙСКИЙ»

**проводит аукцион №120 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года**

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи |
|---|---|---|---|
| | **г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом.3** | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение №12 на 2-м этаже (под офис) | 13,7 | 52,06 |
| | **г. Минск, пр-т Независимости, 49, пом. 3** | | |
| 2 | Изолированное нежилое помещение №13 на 2-м этаже (под офис) | 16,7 | 63,46 |

**Аукцион состоится 15 мая 2017 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по 12 мая 2017 года до 15.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**
**Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.**
**Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.**
**Интернет: www.dvs.by**
**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**
Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.
Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

■ Лекавая бяспека

# І САБЕ, І СУСЕДЗЯМ



**Апошнія 7 гадоў на рынак штогод трапляе звыш 100 найменняў новых айчынных лекаў. У 2015-м, напрыклад, было зарэгістравана 187 найменняў, летась — 116. Гэта генерычныя прэпараты — аналагі, якія даўно выкарыстоўваюцца ў свеце і ўжо даказалі сваю эфектыўнасць. Выраб сваіх — гэта ніжэйшы кошт, бо мы не затрацiліся на выпрабаванні, выхад на рынак і г.д., аднак замяніць такім чынам абсалютна ўсе лекі не ўяўляецца магчымым. У свеце няма ніводнай краіны, якая б выраўляла ўсе прэпараты. Штосьці кожная краіна набывае за мяжой, у тым ліку і мы.**

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення арганізацыі вытворчасці і перспектыўнага развіцця Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Тацццяны ТУМЕЛІ**, за апошнія 5 гадоў у мадэрнізацыю фармпрадпрыемстваў было інвеставана больш за 200 млн долараў (як унутраных рэсурсаў, так і прыцягнутых). Да 2020 года мадэрнізацыя дзеючых вытворчасцяў павінна быць завершана, паралельна будуць стварацца і новыя заводы, скажам, па выпуску антырэтравірусных прэпаратаў.

Звыш 80 працэнтаў лекаў ва ўпакоўках, якія прымяняюцца ў стацыянарах, — айчынныя. Такая прапорцыя захаваецца і надалей. Асартымент між тым будзе пашырацца за кошт тых жа генерыкаў. Фармпрадпрыемствы ўсё актыўней працуюць з буйнымі транснацыянальнымі кампаніямі свету. Pfizer, напрыклад, намераны выраблять лекі на «Белмедпрэпаратах» — з прыцэлам на рэалізацыю не толькі ўнутры краіны, але і ў ЕАЭС.

Перад тым як трапіць на ўнутраны рынак, усе лекі, у тым ліку і імпартныя, праходзяць працэдуру дзяржаўнай рэгістрацыі (гэта сведчыць аб тым, што якасць і бяспека ўжо даказаны), пасля чаго сістэма фармаканагляду адсочвае далейшы лёс кожнага прэпарата — збіраюцца паведамленні ад медработнікаў і фармацэўтаў аб выпадках негатыўных эфектаў. Усё ж такі прэпараты могуць па-рознаму ўздзейнічаць на людзей, бывае і індывідуальная непераноснасць нейкага рэчыва. Міністэрства аховы здароўя можа ў выніку вынесці рашэнне аб прыпыненні дзяржрэгістрацыі і абарачэння на рынку ■

**Пабочны эфект ад «хіміі» можна знізіць**

Адной з найноўшых распрацовак беларускіх вучоных стала работа па зніжэнні пабочных эфектаў вядомых хіміяпрэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў. Гэтыя лекі паспрабавалі спалучаць з субстанцыямі, сінтэзаванымі нашымі хімікамі з Інстытута фізіка-арганічнай хіміі. Выпрабаванні на эксперыментальных жывёлах паказалі, што такое прымяненне робіць магчымым дасягненне супрацьпухліннага эфекту пры выкарыстанні дозы «хіміі» ў 10, а тое і ў 1000 разоў меншай!

■ Візіт да афтальмолага

# Фізкультура патрэбна і блізарукім

**У афтальмалогіі для барацьбы з такімі распаўсюджанымі захворваннямі, як глаўкома або катаракта, паталогія сятчаткі або прыроджаная паталогія, сёння выконваюцца самыя сучасныя спосабы хірургічнага і лазернага лячэння. Укараняюцца ўласныя ўнікальныя распрацоўкі, якія або наогул не выконваюцца ў свеце, або практыкуюцца толькі ў лічаных краінах.**

Летась у дзяржаўных стацыянарах праведзена каля 60 тысяч хірургічных аперацый, каля 30 тысяч — лазерных. Толькі з прычыны адслаення сятчаткі ў Рэспубліканскім афтальмалагічным цэнтры (знаходзіцца на базе 10-й мінскай бальніцы) іх зроблена каля 600. У цэнтры, дарэчы, апераруюць і дзяцей з вельмі цяжкай паталогіяй, акрамя таго, аказваюць неадкладную дапамогу. А на базе 4-й мінскай дзіцячай бальніцы размешчаны Рэспубліканскі дзіцячы афтальмалагічны цэнтр — таксама з самым сучасным абсталяваннем. Наогул у Беларусі практыкуюцца ўсе віды хірургічнага ўмяшання, якія толькі выконваюцца ў свеце. Ва ўсіх рэгіёнах робяць лазерныя аперацыі пры выяўленні рэцінапатыі неданошаных, дзякуючы чаму зніжаецца колькасць інвалідаў па зроку з такой паталогіяй. Становяцца даступнымі і высокатэхналагічныя метады абследавання, імкліва прырастае наогул колькасць розных відаў даследаванняў: функцыянальных за 5 гадоў — у тры разы, ультрагукавых — у два.

Афтальмалагічная паталогія — адна з самых распаўсюджаных праблем са здароўем у дзяцей. Галоўным чынам, сустракаюцца анамаліі рэфракцыі, міяпія. Пакідаць гэта без увагі нельга, бо нават пры слабай ступені блізарукасці могуць быць сур'ёзныя праблемы з сятчаткай, што можа скончыцца незваротнай стратай зрокавай функцыі. Развіваецца ў такіх дзяцей і касавокасць.

Цікава, што дзецям з міяпіяй нельга забараняць фізічную нагрузку, як рабілі раней, калі вызвалялі ад фізкультуры ў школе. Апошнія даследаванні паказалі, што адсутнасць умеранай фізічнай нагрузкі нават спрыяе захворванню! Карыснымі пры анамаліях рэфракцыі будуць плаванне, хада, бег, лыжы, ролікі, бадмінтон, настольны тэніс — галоўнае, абысціся без акрабатыкі.

## АДБЯРЫЦЕ Ў ДЗЯЦЕЙ ДРОБНЫЯ ГАДЖЭТЫ

— Выкарыстанне гаджэтаў з першых гадоў жыцця прыводзіць да парушэння рэфракцыі. Ужо ў 1,5—2 гады мы выяўляем такую праблему ў дзяцей, чые бацькі вельмі радуюцца, калі тыя вылатна спраўляюцца з некаторымі функцыямі мабільнага тэлефона, — кажа **галоўны пазаштатны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, прафесар кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вікторыя КРАСІЛЬНІКАВА**. — Праблема ўжо нават не ў тым, што неабходна дазіраваць сам паток інфармацыі, бо лішак шкодзіць несфарміраванай псіхіцы, а ў тым, што ў дзіцячым узросце вочы яшчэ абсалютна не прыстасаваныя да работы на блізкай адлегласці! Усе цацкі да 3 гадоў павінны быць аб'ёмнымі, мяккімі, яркімі. Нельга дазваляць дзіцяці разглядваць дробны шрыфт. У раннім школьным узросце дзеці павінны карыстацца планшэтамі, прычым у 6—12 гадоў гэта павінна быць у агульнай складанасці каля гадзіны ў дзень, з абавязковымі перапынкамі. 5—15 хвілін прагляду мультфільмаў — таксама толькі на вялікім экране. Ідэальна прапанаваць дзіцяці аўдыякнігі. У процілеглым выпадку малое можа стаць і касавокім за лічаныя месяцы.



■ Не рабі няправільна

# Што лепш для нырак...

Як пазбегнуць самых распаўсюджаных захворванняў мочавыдзяляльнай сістэмы?

**Да іх адносяцца інфекцыі (урэтрыт, цыстыт, піеланефрыт), мочакаменная хвароба і рак мачавога пузыра. У першую чаргу вытрымлівайце правілы асабістай гігіены і абавязкова лячыце ўсе інфекцыі і захворванні, каб прафілактаваць рак мачавога пузыра. Нават «лёгкі» цыстыт можа забяспечыць ускладненні ў выглядзе піеланефрыту. Пазбягайце неабароненага сексу, каб не займець інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам.**

— Падчас цяжарнасці сцеражыцеся цыстыту і піеланефрыту. Пры першых хваравітых сімптомах звярніцеся да ўрача, — рэкамендуе **ўрач-тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі Мінска Кацярына МАШЧАНКА**. — Не парушайце водна-салявы абмен, не злоўжывайце салёным, тлустым, смажаным і выпечкай. Нельга курыць: курэнне павышае рызыку развіцця злаякаснай пухліны мачавога пузыра ў 4 разы. Лішняя вага павялічвае верагоднасць узнікнення інфекцыйных захворванняў, узмацняе нагрузку на ныркі. Не дапускайце таго, каб вага адхілялася ад нормы больш як на 5—10 працэнтаў. Дэфіцыт фізічнай актыўнасці стварае застой крыві ў ніжняй часткі тулава, зніжае імунітэт. Высокі ціск пагаршае стан сасудаў, якія харчуюць ныркі, мочавыдзяляльнай сістэмы. У хворых на цукровы дыябет у 4—5 разоў павышана рызыка інфекцыйна-запаленчых захворванняў мочавыдзяляльнай сістэмы.

- ✓ **Пазбягайце пераахалоджвання.**
- ✓ **Не насіце цесную бялізну.**
- ✓ **Не злоўжывайце алкаголем, кавай і чаем.**
- ✓ **Выпівайце дастатковую колькасць вады.**
- ✓ **Ужывайце гародніну і фрукты.**
- ✓ **Рэгулярна прымайце душ.**
- ✓ **Трымайце мышцы ў тонусе — рухайцеся.**
- ✓ **Сачыце за ўзроўнем цукру ў крыві і артэрыяльным ціскам.**

■ Псіхалогія для ўсіх

# ПАЎМЕСЯЦА БЕЗ НАСТРОЮ?



**75 працэнтаў людзей, якія пакутуюць ад дэпрэсіі, не атрымліваюць адэкватнага лячэння — такія звесткі прыводзіць Сусветная арганізацыя аховы здароўя. Праблема пагражае зніжэннем працаздольнасці і нават самагубствам. Між тым магчымасці для вырашэння праблемы ёсць.**

Дэпрэсія можа напаткаць каго заўгодна, нават дзяцей, якія будуць скардзіцца пры гэтым на нейкае дрэннае самаадчуванне — боль у жываце або немагчымасць заснуць. Гэта можа збіць з панталыку нават урача, які будзе шукаць саматычнае, а не псіхічнае захворванне. Таму важна вучыць дзяцей звяртацца з нейкімі пытаннямі да школьных псіхолагаў, а таксама ў цэнтры дружалюбнага стаўлення да падлеткаў, куды, як паказвае практыка, звяртаюцца дзякуючы прынцыпу ананімнасці нават бацькі. Праўда, дарослыя могуць атрымаць дапамогу, зноў жа, на ананімнай аснове і ва ўстановах аховы здароўя (21 кабінет псіхалагічнай дапамогі працуе ў Мінску пры звычайных паліклініках).

— Дэпрэсія, дарэчы, не прыводзіць адразу да пастаноўкі на ўлік, абмежавання ў вадзіцельскіх правах і г. д., а таму можаце смела звяртацца ў спецыяльныя псіхіятрычныя медустановы, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Аляксандр СТАРЦАЎ**. — Дэпрэсія лячыцца захворваннем, калі паніжаны настрой назіраецца больш за два тыдні, спалучаючуся пры гэтым разумовая, эмацыянальная і рухальная затарможанасць. А для таго, каб пазбегнуць падобных непрыемнасцяў, рухайцеся наперад па кроку, разбівайце вялікі аб'ём работы на часткі. Важныя рашэнні не прымайце ў адзін момант — абмяркуйце з кім-небудзь, параўнайце, парайцеся. Знаходжанне ў адзіноце толькі ўзмацняе трывожнасць, недаверлівасць. Выкарыстоўвайце арсенал тых рэчаў, якія вам прыўзнімаюць настрой. Хадзіце пешшу, штодня прымайце любыя водныя працэдуры, каб зняць напружанне. А спіртное і каляровых напояў паменш — нервовая сістэма вам аддзячыць.

Праблема дэпрэсіі можа быць звязана і з наяўнасцю любога хранічнага захворвання, напрыклад сардэчна-сасудзістага (у краіне сёння каля 2 млн людзей хварэюць на артэрыяльную гіпертэнзію, каля 1 млн — ішэмічную хваробу сэрца, 415 тысяч — цэрэбраваскулярныя захворванні). Невылечнае захворванне абавязкова ўплывае на нашу псіхіку. З другога боку, і стан нашай псіхікі ўплывае на вынік лячэння той жа гіпертэнзіі і стэнакардыі. Ад спецыялістаў у такім выпадку патрабуецца ўсё гэта ўлічваць, бо прымяненне тых жа бэтаадрэнаблакатараў можа ўзмацніць дэпрэсію. Хочаце сабе дапамагчы — паведамляйце ўрачу пра падобныя праблемы.

## ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВЫ ЗАПАДОЗРЫЛІ Ў СЯБЕ ДЭПРЭСІЮ

• Падзяліцеся вашымі пачуццямі з чалавекам, якому давяраеце. Звярніцеся да спецыяліста, спачатку да ўчастковага тэрапеўта.

• Працягвайце рабіць тое, што прыносіла вам некалі задавальненне, нават калі няма настрою.

• Падтрымлівайце стасункі з сям'ёй.

• Гуляйце, выконвайце якія-небудзь фізічныя практыкаванні.

• Не парушайце рэжым харчавання і сну.

• Майце на ўвазе, што любыя псіхастымулятары могуць пагоршыць сітуацыю.

• Каб не прапусціць дэпрэсію ў свайго дзіцяці, шукайце час, каб праводзіць яго разам з ім. Заўсёды спрабуйце высвятліць, што непакоіць дзіця, што адбываецца ў школе.

• Дапамагайце ўсё гэта зрабіць таму, у каго ёсць дэпрэсія, але не забывайце пры гэтым пра сябе.

• Дэпрэсія пасля нараджэння дзіцяці — вельмі распаўсюджаная з'ява. Ад яе пакутуе кожная шостая маладая мама, якая становіцца няздольнай выконваць паўсядзённыя справы, губляе цікавасць да ўсяго, што раней прыносіла задавальненне. Як правіла, пры гэтым з'яўляецца санлівасць або бяссонніца, трывога, нерашучасць, пачуццё віны і адчаю, думкі аб прычыненні сабе шкоды, слёзы без прычыны, прападае апетыт, зніжаецца канцэнтрацыя ўвагі, пачынае здавацца, што няма сіл даглядаць ні сябе, ні дзіця. Без адпаведнага лячэння пасляродавая дэпрэсія можа цягнуцца месяцы і нават гады. Таму рабіце ўсё, аб чым сказана вышэй, і пачынайце з візіту да ўрача.

• Памятайце: вы або вашы блізкія могуць выздаравець, як гэта адбылося са многімі іншымі людзьмі ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

Сямейная газета
Выпуск № 7 (74)



## НАВОШТА ДОМ... БЕЗ ГІТАРЫ?

Штораз, калі завітваю ў госці да бабулі мужа, мы з ёй разам пячом піражкі з капустай. І Тацццяна Віктараўна расказвае мне розныя гісторыі з дзяцінства свайго ўнука. Найбольш мне спадабалася вось гэта. Аднойчы, калі Вову было гадоў пяць, ён сказаў: «А чаму я павінен рабіць так, як вы хочаце? Чаму я не магу рабіць так, як хачу я?»

Мне вельмі блізкі погляд на выхаванне дзяцей практыкуючага псіхолага Вячаслава Вета. Яго сыну цяпер 17. І мінулым летам пасля школы ён нікуды паступаць не стаў. «Працаваць пайшоў і ўжо сам сябе забяспечвае. Амаль ва ўсім. І ўсе вакол з гэтай нагоды вельмі нервуюцца. І ўвесь час у мяне пытаюцца: «А ты, Слава, што на гэты конт думаеш?» І, пачуўшы мой адказ, здзіўляюцца, чаму я такі спакойны і зусім не спрабую неяк на гэта паўплываць. А я насамрэч зусім не спакойны! Ведалі б яны, як мне цяжка. Трымацца той лініі, якую я выбраў калісьці ў адносінах са сваім сынам. Я быццам іду супраць нейкага цячэння. Магутнага і абсалютна ўпэўненага ў тым, што яно мае рацыю. Яна, мая сям'я, дакладна ведае, што трэба майму сыну. І ў іх няма ніякіх сумненняў. Вядома, кідаць працу! Вядома, паступаць у інстытут! Я ж думаю, што гэта не іх справа. І нават не мая. Гэта справа майго сына. І толькі яго. Гэта яго жыццё.

Я ў свой час вельмі хацеў у літаратурны інстытут паступіць. Але мой тата, калі пра гэта пачуў, так на мяне паглядзеў, што я адразу і думаць пра гэта перастаў. І пайшоў у інжынеры. Таму што «на хлеб з масліцам заўсёды хопіць». І што я цяпер, мікрасхемы распрацоўваю? Ці тэлевізары паяю? Не. Я кожны дзень пішу. І нават, бывае, ноччу. І хто з нас меў рацыю, атрымліваецца? Я ці мой тата?! Таму не ім вырашаць, як жыць майму сыну. І не мне. Няхай сам вырашае. А ад мяне патрабуецца толькі адно: ісці за сваім шчасцем. І ўсімі сіламі падтрымліваць яго ў тым, каб ён ішоў — за сваім.

Не, вядома, я мог бы пачаць на яго ціснуць, забараняць, абмяжоўваць. Але я зразумеў: што калі цяпер ён і сагнецца пад маім прэсам, то пасля гэтага ўжо ніколі не зможа мне давяраць. І перастане мяне паважаць. Не, для мяне мае адносіны з сынам у сто разоў важнейшыя, чым усе яго адукацыі разам узятыя...»

Мае сваякі некалькі гадоў таму пачалі будаваць дом за горадам. Муж кумы працаваў на высокааплатнай працы. Таму будоўля ішла даволі хутка. Але днямі я даведалася, што Алесь звольніўся з працы. Вырашыў рызыкнуць: уклаці грошы ў свой кававы бізнес. Яго маці, калі даведалася, адразу ж пачала адгаворваць. Маўляў, як вы будзеце жыць? У вас жа двое дзетак. Дзе такі заробак яшчэ можна знайсці? А раптам не атрымаецца... Грошы ж укладзеныя не вернеш... «Яшчэ гады два таму я, напэўна, адрэагавала б прыкладна так, як і свякроў, — усміхаецца кума. — Цяпер жа ні на кроплю не сумняваюся, што проста абавязана падтрымаць мужа. Ну, нічога, пераедзем у дом крыху пазней. Затое мы з дзеткамі штодзень будзем бачыць побач з сабой мужа і тату з вачыма, якія свецяцца ад радасці. Бо ён рэалізоўвае сваю даўнішнюю мару».

...Некалькі месяцаў таму муж вярнуўся дадому са скруткам незвычайнай формы — штосьці беражліва было захутана ў шарсцяную коўдру. «Не чапай пакуль, — сцішыў маю цікаўнасць. — Няхай адагрэецца». Неўзабаве ён папрасіў мяне выйсці з пакоя. І праз тры хвіліны я пачула адтуль незвычайныя гукі. Калі зайшла, убачыла на зэдліку шчаслівага мужа з 12-струннай партугальскай гітарай. Якраз у гэты момант яму патэлефанаваў тата. Вова не стрымаўся і падзяліўся з ім сваёй радасцю. У адказ пачуў: «Навошта столькі грошай патраціў на гітару?.. Вы на дом лепш збірайце». На што муж адказаў: «Навошта мне дом... без гітары».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
nadzieja@zviazda.by

■ Перадсвяточнае

# ПАСКА

**В**ЯЛІКДЗЕНЬ у пасёлку і суседніх вёсках завецца Паска. Гэтае свята Дарынка любіць не менш чым іншыя. А чаго ж тую Паску не любіць, калі яна нясе з сабой столькі прыемнага, смачнага, новага.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхары вёскі Хатынічы Ганцавіцкага раёна Андрэй Андрэевіч і Надзея Васілеўна Ярашэвічы на Вялікдзень заўсёды сустракаюць і сваіх унукаў, і суседскіх дзяцей, якія прыбягаюць павіншаваць са святам.**

■ Тыя, хто побач

# «З 12 гадоў хлопчыка павінен выхоўваць тата»

**У гэтым перакананы Леанід ЗАІКА, вядомы эканаміст, якога нашы пастаянныя чытачы ведаюць не па чутках. Шмат гадоў ён даволі часта выступаў на старонках «Звязды» ў якасці эксперта. На днях мы завіталі дадому да вучонага, які адзін выхоўвае 13-гадовага сына Уладзіка. І распыталі, як ён спраўляецца адначасова з роляй мамы і таты.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Майку з жартаўлівым надпісам Леаніду Заіку падарыў сын.**
**— Любіце паляжаць на канапе перад тэлевізарам, як і большасць мужчын? — пытаюся.**
**— Што вы? Гэта не мужчына! Мужчына заўсёды павінен быць пры справе, заняты, клапаціцца пра блізкіх, забяспечваць псіхалагічны камфорт у сям'і.**

### «Самым цяжкім было сказаць сыну, што мамы не стала»

— Заходзьце, разувайцеся. Можаце, вядома, і не разувацца, калі хочаце памыць падлогу *(з самага пачатку размовы спадар Леанід шмат жартуе)*. Праходзім у гасціную. «Шпалеры ў мяне тут клеіла кандыдат псіхалагічных навук *(мае на ўвазе другую жонку Жанну Грынюк, якая чатыры гады таму памерла ад раку)*.

***— Леанід Фёдаравіч, апошнім часам павялічылася колькасць людзей, якія паміраюць ад раку ў росквіце сіл...***

— Так, і мая жонка з іх ліку... Прайшло 4 гады... Жанна — моцны чалавек. Напрыканцы жыцця яна магутны акорд зрабіла. Уяўляеце, яе выпісваюць з бальніцы пасля курса хіміятэрапіі, а праз два тыдні яна праводзіць конкурс «Брэнд года». За месяц да смерці ў яе была вялікая камандзіроўка ў ЗША. Потым выступала на канферэнцыях у Швейцарыі і ў Славакіі, інтэрв'ю давала. Трымалася годна да апошняга.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

■ На слыху

# ВУСАТЫ НЯНЬ

## Чуткі, здагадкі і праўда пра абавязковы адпачынак для таты

**У нашай краіне разглядаецца пытанне аб увядзенні абавязковага сацыяльнага водпуску для бацькі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці. Гэтая навіна ўжо паспела абрасці рознымі чуткамі, здагадкамі, думкамі і каментарыямі. Давайце ўсё ж такі разбяромся, што гэта такое і навошта патрэбна падобнае новаўвядзенне.**



Дырэктар адной са сталічных кавярняў Кірыл БУДКОЎСКІ з дачушкай (здымак з выставы «Місія таты», якую ладзіў Фонд ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі).

Фота Аляксандра ЖДАНОВІЧА.

### Адпачынак абавязковы для наймальніка, а не для бацькі

— Гэта не дэкрэтны водпуск, — адразу ўдакладняе **загадчык цэнтра сацыяльна-дэмаграфічных даследаванняў Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Наталля КРАСОЎСКАЯ**. — Дэкрэтны водпуск — гэта водпуск па цяжарнасці і родах, і ў яго можа сысці толькі мама. Але ва ўсім свеце ёсць яшчэ водпуск па доглядзе за дзіцем. У нас ён складае тры гады, і сыходзяць у яго таксама ў пераважнай большасці мамы.

Цяпер, па словах Наталлі Красоўскай, прапрацоўваецца пытанне аб тым, каб тата таксама мог пайсці ў кароткатэрміновы водпуск для аказання дапамогі па доглядзе за дзіцем. Гэта асабліва важна ў першыя, самыя цяжкія дні, калі мама і немаўля адаптуюцца да новых рэалій.

**Дзеці, якія праводзяць час з абаімі бацькамі, лепш вучацца, яны эмацыянальна больш стабільныя і наогул больш паспяховыя ў жыцці.**

У прынцыпе і сёння, згодна з Працоўным кодэксам (арт. 185), бацька мае права на сацыяльны водпуск да 30 сутак па доглядзе за дзіцем. Гэта так званы водпуск па сямейных абставінах. Аднак яго прадастаўленне або непрадастаўленне поўнасцю залежыць ад жадання работадаўца.

— Бацькаўскі водпуск азначае, што тата будзе мець права ўзяць яго адразу пасля нараджэння малечы ці ў любы іншы зручны час, на працягу якога яго жонка знаходзіцца ў дэкрэце (такім чынам, гэта не значыць, што мама павінна будзе выйсці на работу, яны будуць даглядаць малое разам), — тлумачыць Наталля Красоўская.

Пры гэтым эксперт акцэнтуе ўвагу на тым, што слова «абавязковы» тут адносіцца не да бацькі, які будзе вырашаць сам, патрэбны яму такі водпуск ці не, а да работадаўца. Гэта значыць, калі мужчына вырашыў сысці ў водпуск у сувязі з нараджэннем дзіцяці, работадавец не будзе мець права адмовіць яму.

Паводле слоў спецыялістаў НДІ працы, зараз створана міжведамасная рабочая група, у якую, акрамя заканадаўцаў, увайшлі навуковыя супрацоўнікі, прадстаўнікі аб'яднанняў наймальнікаў і прафсаюзаў, міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя і інш.

На сёння бацькаўскі водпуск уведзены больш чым у 25 краінах свету. Ён прадастаўляецца практычна адразу пасля нараджэння дзіцяці, а яго працягласць вар'іруе ад 1 дня да 13 тыдняў. Часцей за ўсё такі водпуск даецца на два тыдні. Дзесьці яго цалкам аплачвае наймальнік альбо наймальнік напалову з прафсаюзамі, ёсць і неаплатныя варыянты. Найбольш прагрэсіўнае заканадаўства ў гэтай сферы, па словах экспертаў, — у скандынаўскіх краінах.

### Мужчына, у якога ёсць дзеці, больш клапоціцца пра сваё здароўе

**Намеснік прадстаўніка Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) у Беларусі Алена КАСЬКО**, кажучы аб неабходнасці бацькаўскага водпуску, звяртае ўвагу на працягласць жыцця мужчын і жанчын у Беларусі. Жанчыны ў нас жывуць больш за мужчын у сярэднім на 11 гадоў, тым часам як у іншых краінах такога вялікага разрыву не назіраецца. Пры гэтым прычына меншай працягласці жыцця мужчын у немалой ступені звязана з іх ужываннем алкаголю і тытуню, але не толькі. Яны ў 3,5 раза больш паміраюць ад знешніх прычын: гэта няшчасныя выпадкі, прафесійны траўматызм, атручванні, забойствы, самагубствы. Пры гэтым навукова даказана, што мужчыны, якія праводзяць больш часу са сваімі дзецьмі, схільныя да менш рызыкоўных паводзін і лепш клапоцяцца пра сваё здароўе.

Алена Касько адзначае, што клопату пра дзяцей, звязанага з тым, каб накарміць іх, апрануць, забяспечыць неабходным, — мала. Даследаванні паказваюць, што інтэлектуальны і эмацыянальны кантакт з малечай — выхаванне і гульні — вельмі важны, а ў Беларусі ён знаходзіцца на даволі нізкім узроўні, бо ў дарослых не хапае на гэта альбо часу, альбо жадання. Між тым сацыяльныя даследаванні даказваюць, што дзеці, якія праводзяць час з абаімі бацькамі, лепш вучацца, яны эмацыянальна больш стабільныя і наогул больш паспяховыя ў жыцці.

— Вельмі важна прыцягваць бацькоў да выбудоўвання адносін з дзецьмі з самага ранняга ўзросту, а не па прынцыпе «падрасце, вазьму з сабой у гараж ці на рыбалку», якім традыцыйна кіруюцца многія, — згодны з экспертам **сямейны псіхолаг, каардынатар праекта «Тата-школа» ў Беларусі Раман КРУЧКОЎ**.

Тата-групы ў Мінску збіраюцца з 2009 года. За гэты час праз іх прайшло каля 500—600 бацькоў і нават дзядуляў, якія хочуць стаць бліжэйшымі да сваіх унукаў, прызнаючы, што ў свой час не змаглі гэта зрабіць са сваімі дзецьмі і цяпер хочуць выправіць памылкі.

Дарэчы, адзін малады тата, які прайшоў такую тата-школу, на пытанне аб тым, што яму далі цесныя зносіны з маленькім сынам, адказаў проста: «Дзеці хутка пасталяюцца ад эгаізму». І гэта яшчэ адзін бонус бацькаўскага водпуску, які да таго ж умацоўвае сямейныя сувязі.

**Святлана БУСЬКО.**

*busko@zviazda.by*

■

**• У ТЭМУ**

У Швецыі на час такога сацыяльнага водпуску за мужчынам захоўваецца 90% ад заработнай платы, у Італіі і Нарвегіі ён не аплачваецца. У Бельгіі такі водпуск аплачвае наймальнік: першыя тры дні захоўваецца 100% заробку, астатнія 82 дні дзейнічаюць пэўныя абмежаванні.

У Эстоніі і Венгрыі за бацькам таксама захоўваецца 100% заробку, водпуск аплачваецца дзяржавай. Польшча дае аплатныя два тыдні. У Славеніі першыя 15 дзён захоўваецца 90% заробку, але не больш, чым дзве сярэднія зарплаты, астатнія 75 дзён не аплачваюцца.

**Па апошніх звестках, таты атрымаюць магчымасць «сядзець з малымі» не менш за 20 дзён. Наколькі беларускае грамадства падрыхтавана да такога новаўвядзення? Карэспандэнт «Звязды» выслухала рознабаковыя меркаванні.**

**Міхаіл КРЫВАТУЛАЎ, бацька чацвярых дзяцей:** «Шчыра кажучы, сам сядзеў з дачкой сем гадоў таму. У адпачынак прыйшлося пайсці па жыццёвых абставінах. З жонкай мы разышліся, а дзве дачкі засталіся пры мне. Спачатку было складана, але потым звыкся. Як цяпер памятаю — баяўся спаць уначы. Я вельмі моцна засынаю, дык хваляваўся, каб з дзіцем што-небудзь не здарылася. Праз некаторы час ажаніўся другі раз. Сёння я самы шчаслівы на свеце бацька чацвярых дзяцей. З малымі сядзіць жонка, а я зарабляю грошы... Сем'і розныя бываюць як па даходах, так і ў маральным плане. Таму ўсё вырашаць трэба ў сям'і».

**Ірына АЛЬХОЎКА, старшыня праўлення МГА «Гендарныя перспектывы», член Нацыянальнага савета па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў:** «Акрамя ўвядзення абавязковага водпуску для татаў, у рамках новага Нацплана разглядаецца пытанне аб усталяванні святочнага дня — Дня бацькі. Я станоўча стаўлюся да абедзвюх ініцыятыў. Бацькаўскі водпуск — гэта міжнародная перадавая практыка, якая дазваляе павялічыць унёсак мужчын у выхаванне дзяцей. Гэта спрыяе іх інтарэсам дзіцяці, так і раўнапраўнаму размеркаванню абавязкаў у сям'і. Жанчыны расходуюць на вядзенне гаспадаркі і выхаванне дзяцей у тры разы больш часу, чым мужчыны. Даследаванні паказваюць, што рост колькасці бацькоў, якія бяруць адпачынак па доглядзе за дзіцем, залежыць ад двух прычын — яго працягласці (не менш за 14 дзён) і памеру аплаты (не менш як 50% ад зарплаты). Я лічу, што калі мужчына будзе ўмець мяняць падгузнік, то гэта ніяк не падарве яго мужнасці. Дзень бацькі — гэта сімвалічнае свята, якое неабходна для павышэння прэстыжу бацькоўства, у першую чаргу сярод саміх татаў і ў грамадстве ў цэлым».

**Нэлі КСЯНЕВІЧ, псіхолаг, аўтар кніг пра мастацтва жыць:** «У мяне на гэты конт ёсць цікавая ідэя: калі б у дэкрэт спачатку ішла маці, а потым бацька — гэта наогул ідэальны варыянт. За яго я плаціла б у два разы больш. Тата павінен пакаштаваць мамінага хлеба, каб дзіця да яго прывязалася. Але ж і маці не павінна адвыкаць ад немаўляці. З пункту гледжання псіхалогіі, малому надзвычай неабходная маці ў першыя паўтара года жыцця. Калі цалкам у дэкрэт выходзіць бацька, то мы пазбаўляем дзіця вельмі важнага складніка. Ёсць адваротны бок і ў выпадку, калі маці ўвесь час сядзіць з малым: максімум шлюбных здрадаў прыпадае на час цяжарнасці жонкі і пасляродавы перыяд. Я лічу, што вельмі разумна, каб кожны з партнёраў браў на сябе гэты абавязак па чарзе. Монакультура, калі жанчына — гэта кухня і дзеці, а мужчына — бізнес, засталася ў мінулым. Сёння жанчына актыўная ў соцыуме, а значыць, мужчына павінен дапамагчы ёй дома».

**Вераніка СЯРДЗЮК, кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля»:** «Не разумею, навошта гэтае новаўвядзенне? У нас жа прадугледжана магчымасць любому родзічу малога аформіць на сябе водпуск па доглядзе і сядзець з дзіцем. Ці будуць гэтыя 20 дзён стымуляваць бацькаўскія пачуцці, ці карысна гэта для малога? Справа ў тым, што, сыходзячы з псіхалогіі ранняга перыяду развіцця дзіцяці, да двух гадоў малому неабходны толькі адзін персанальны дарослы. Пажадана маці, бо ён звыкся з ёю ўжо падчас цяжарнасці. Догляд за немаўлём — гэта цяжкая праца з гледжання заўсёднага напружання ўвагі, а жанчына на фізіялагічным узроўні больш прыстасаваная да гэтага. А вось тата далучаецца да выхавання дзесьці пасля трох гадоў, адкрываючы малому свет соцыуму. Таго часу, што бацька аддае малому пасля работы і на выхадных, дастаткова. Калі сужэнцы думаюць інакш, яны заўсёды могуць памяняцца месцамі ў дэкрэце. А вось абавязваць татаў сядзець з дзецьмі — гэта крыху смешна. Калі даводзіць ідэю гендарнай роўнасці да лагічнага завяршэння, тады неабходна патрабаваць абавязковай службы ў арміі для жанчын, а то нейкая дыскрымінацыя атрымліваецца!»

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**

*veronika.ulasevich@mail.ru*

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

Летась водпускам па доглядзе за дзіцем у Беларусі скарысталіся больш за 302 тысячы чалавек. Сярод іх — 3097 мужчын. Гэта не толькі таты, але і дзядулі. Атрымліваецца, што ў нашай краіне толькі 1% мужчын карыстаецца заканадаўчай магчымасцю водпуску па доглядзе за дзіцем.

Разам з тым дэкрэты для татаў сталі папулярнай альтэрнатывай у розных краінах свету. У Швецыі такой магчымасцю карыстаецца каля 80% бацькоў. У Партугаліі мужчыну пагражае штраф, калі ён не ахвяруе на дзіця пяць дзён дэкрэту. У Японіі таты ідуць на вымушаны водпуск па доглядзе за малым на 40 дзён.

# ПАСКА

***(Заканчэнне. Пачатак на 13-й стар.)***

— Мам, а мам, а калі ў гэтым годзе будзе Паска? — ходзяць следам за маці і дураць ёй галаву Дарынка з Шуркам.

— Яшчэ не скора, — адмахваецца ад іх маці. А сама ідзе да адрыўнога календара, які вісіць на адмысловым каляндарніку-палічцы. Каляндарнік знатны! Яго выразалі лобзікам з фанеры старэйшыя браты Дарынкі — Сцяпан з Мацвеем. Зверху над самім календаром знаходзіцца скрыначка для паштовак і розных квітанцый. Яна аздоблена галінкамі дрэў. З аднаго боку календара скача вавёрка, а з другога яго нібы дзяўбе дзяцел. Майстраванне размалёвана хлопцамі рознакаляровымі фарбамі і пакрыта лакам.

**Зморaная за дзень, Дарынка ледзь цягнецца да ложка з адной думкай: «Хутчэй бы раніца. Яны ўсе апрануцца ў святочнае, у абноўкі і будуць біцца ў мацакі...»**

— Паска, дзеткі, кожны год прыпадае на рознае чысло, але ўсё роўна яна наступае ў першую нядзелю поўні, якая надыходзіць за сакавіцкім раўнадзенствам, — выдае маці пасля нядоўгага гартання лісткоў календара.

Нічога не разумеюць з гэтага паведамлення малыя, але калі маці так кажа, то так яно і ёсць, і будзе.

Калі набліжаецца Паска, у пасёлку гэта адразу становіцца і відаць, і чуваць, бо ўсе да яе рыхтуюцца: і старыя, і малыя. За два-тры тыдні амаль з кожнага двара чуецца парасячы віскат — аднасельцы забіваюць кабаноў. У Дарынчынай сям'і бацька з хлопцамі ўпраўляюцца са сваім парсюком раніраненька, пакуль малая яшчэ спіць. А якая ж Паска без скаромнага? Або без яек? Напярэдадні свята іх спажыванне змяншаецца адчувальна: усе ведаюць, што ў вялікім рэшаце ў сенцах яны збіраюцца «на Паску».

Асаблівае месца ў штогадовым рытуале сустрэчы Вялікадня адводзіцца прыбіранню хаты. Для гэтага падбіраецца і намячаецца сонечны выхадны дзень (каб усе былі дома). З самага ранку браты выносяць на прасушку і праветрыванне хатняе начынне: матрацы, коўдры, дываны. Анюта з Дарынкай — падушкі. На працягу дня яны ляжаць на лаўках, табурэтках і некалькі разоў за гэты час пераварочваюцца. Потым іх хлопцы палкамі малоцяць-выбіваюць ад накопленага за зіму пылу.

А тым часам маці з сястрой беляць хату: маці — столь, сястра — сцены, печ, грубку. На печ і грубку пабелка гатуецца асобна — мел заліваецца кіпнем. Гэта робіцца для таго, каб ён «не браўся» за адзежу. Дарыньцы пры прыгатаванні пабелкі дазваляюць падсініць яе. У шклянцы разводзяцца стрыжні хімічных алоўкаў або з маленькага пакуначка сінька. У пасудзіну з мелам абавязкова дабаўляецца малако. Для чаго гэта робіць маці, Дарынка пакуль не разумее. Хутчэй за ўсё, каб хата пахла малаком. Калі Дарынка была зусім малая, дык яна ўмудрылася бухнуць у вядро з пабелкай усю шклянку з той сінькай. Пабелка стала не сіняватай, а цёмнасіняй, ледзь не чорнай. Прыйшлося яе зліваць і разводзіць новую. Пасля таго выпадку Дарынчыну руку прытрымлівае маці або сястра — далей ад шкоды.

З бляшанкі з-пад кансерваў Дарынка беліць-коўзае дзверкі грубкі і самы яе ніз. Ёй яшчэ даручаюць пабяліць засланку з печы. Дарынка стараецца, уся з ног да галавы запэцкалася, нібы не грубку бяліла, а яе хтось узяў ды пабяліў. Закончыўшы сваю работу, яна бяжыць на двор — хваліцца братам і бацьку, якая яна «рабацяшчая». Яна не бачыць, як Анюта, скочыўшы з табурэткі на падлогу, падпраўляе яе пабелку-мазаніну.

— А мая ты дачушка маленькая, а мая ты гарапашніца! Ды вы тут, дзеўкі, без Дарынкі наўрад ці справіліся б, — кажа бацька, звяртаючыся да маці і сястры, зайшоўшы ў хату. Затым лезе ў кішэню свайго форменнага пінжака, які на час пабелкі здымаецца з вешалкі і захоўваецца ў шафе, і дастае цукерку. Маці з Анютай па-змоўніцку пераглядваюцца і таксама хваляць Дарынку.

— Не кажы, хлопец, мы ж бы да вечара не ўправіліся без яе помачы, — кажа маці.

Дарынка млее ад гонару і шчасця.

За беленнем наступае чарга вокнаў. Анюта мые іх спачатку адной вадой, потым яшчэ адной, а напаследак аблівае шыбіны з конаўкі. Са двара — таксама. Калі вада сцякае, яна націрае шкло газетамі са старой падшыўкі «Чыгуначнік Беларусі». Вокны аж зіхацяць ад бляску, і за імі настае чарга падлогі, якая нібы пабелена.

Пакуль «дзеўкі» ўвіхаюцца ў хаце, на дворы і на агародзе наводзяць парадак «хлопцы» — бацька і браты. Агарод зграбаецца ад старога бульбоўніка і складваецца ў кучы. Падмятаецца і двор, а смецце кідаецца да тых жа куч і спальваецца. Сінія клубы дыму валяць, уздымаюцца да неба на агародах і ў суседзяў.

Пад вечар у хату заносяцца выбітыя, высушаныя, напоеныя свежым паветрам матрацы і падушкі. Ложкі засцілаюцца ўсім чыстым.

Як утульна, як хораша ў чыстай-чысцюткай хаце! Здаецца, што яна аж звініць ад той чысціні. Саміх яе насельнікаў пасля такой гразкай і пыльнай работы чакае падрыхтаваная мужчынскай палавінай сям'і лазня.

Перад самай Паскай, у суботу, маці ў вялікай місцы замешвае цеста на кулічы, кліча пры гэтым сваіх дачок — каб гледзелі і вучыліся. Для Анюты матчына навука ўжо добра знаёмая, а вось Дарынка дапускаецца ў якасці вучаніцы першы раз. Яна старанна водзіць вачыма за кожнымі рухамі маці і стараецца ўсё добра запомніць. «У жыцці ўсё спатрэбіцца», — прыгаворвае маці, накрываючы міску зрэбным ручніком і ставячы яе на чэран цёплай печы — каб цеста «падышло». Дарынцы з Шуркам яна даручае выразаць кружочкі з воданепранікальнай паперы для місачак-формаў рознага калібру. Потым яна іх змашчуе растопленым каровіным маслам і напоўніць цестам.

Анюта тым часам шаруе лягчэйшы вялікі чыгун, у якім звычайна варыцца бульба свінням. Чыгун гатуецца пад яйкі-крашанкі. У ім змесціцца іх некалькі дзясяткаў — каб хапіла адарыць знаёмых і сяброў сям'і. Дарынцы даручаюць паздымаць шалупінне з цыбулі — у ім будуць варыцца яйкі. Перад самым апусканнем іх у чыгун маці ў цёплым растворы вады з содай перамывае кожнае, тлумачыўшы малой дачцэ, што гэта робіцца для таго, каб яйкі роўна пафарбаваліся.

Бацька гатуе для запякання сцягно — націрае яго соллю, перцам, часнаком. Кумпяк займае месца ў чарзе ў печ — чаго там толькі ў ёй за дзень не гатуецца... За дзень да свята яна працуе з ранку да ночы, як і ўся сям'я. Вечарам, калі «ўсё пароблена», Анюта з хлопцамі збіраюцца на «ўсяночную» — у гонар Паскі яны разам з аднагодкамі будуць паліць вялізнае вогнішча «на Палянцы», а побач з ім, ужо на меншым, смажыць на арэхавых кіёчках сала і пякчы бульбу. Кіёчкі хлопцы гатуюць загадзя. Дарынка да гэтага начнога відовішча яшчэ не дарасла, і яе пасылаюць спаць. Зморaная за дзень, яна ледзь цягнецца да ложка з адной думкай: «Хутчэй бы раніца. Яны ўсе апрануцца ў святочнае, у абноўкі і будуць біцца ў мацакі...»



Вясковыя дзеці ў велікодную раніцу таксама ходзяць «па яйкі» — гэтак называецца валачобная традыцыя: хлопчыкі і дзяўчаткі, калі прыходзяць у хату, абвяшчаюць пра ўваскрэсенне Ісуса Хрыста і атрымліваюць велікодныя падарункі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У вёсцы Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна захаваўся велікодны звычай хадзіць у валачобнікі. Людзям старэйшага ўзросту падабаецца, калі ў іх дамы прыходзяць моладзь з песнямі, пажаданнямі і, вядома, з традыцыйнымі гульнямі. Адна з такіх — качанне пафарбаваных яек па латку альбо па жалабку.

А потым наступае сама Паска.

Назаўтра будзіць (як заўжды) нікога не трэба — усе падхопліваюцца самі, а Дарынка — першая. Сям'я выстройваецца на кухні, дзе маці ўжо прыгатавала зялёную міску з крашанкамі і заліла іх калодзежнай вадой. Спачатку бацькі, потым яны ўсе — дзеці, апаласкваюць твары той вадой, прыгаворваючы: «Каб жа я была ўвесь год такой здаровай, краснай і яснай, як гэтыя яйкі!» Выцершыся вышытым ручніком, усе садзяцца за святочны стол. А на ім чаго толькі няма: паляндвіца, вэнджаная і смажаная каўбасы, застыўшыя (хоць нажом рэж) у вялікіх талерках студзень і кісель, марынаваныя і квашаныя грыбы, капуста, агуркі, яблыкі... А ў цэнтры стала — талеркі з крашанкамі і пахучымі кулічамі. З іх, а яшчэ з гульні «ў біткі» абавязкова пачынаецца святочная трапеза. А яшчэ са слоў маці, якая, сядаючы на сваё месца, казала: «Дай, Божачка, каб увесь год у нас такі стол быў!»

Пасля святочнага сняданку ўсе разыходзяцца па сваіх справах: хлопцы бягуць да сяброў, сястра да сябровак, а маці з бацькам ідуць на вуліцу. Там толькі і чуваць: «Хрыстос уваскрос! Сапраўды ўваскрос!». Гэта суседзі вітаюць адно аднаго і пры гэтым тры разы цалуюцца. Лаўкі каля кожнага двара заняты «пад завязку». Іх не хапае, і людзі выносяць з хат табурэткі, а некаторыя і сталы. Хтосьці грае на гармоніку, хтосьці зацягвае песню, іншыя танцуюць, а аматары іграць у даміно, карты, шашкі гуртуюцца побач.

А Дарынка? Ого! Колькі ў яе спраў у гэты дзень! Па-першае, ёй трэба сустрэцца з закадычнымі сяброўкамі і абмяняцца з імі крашанкамі, а яшчэ ж і рознымі выразкамі-малюнкамі для іх самаробных альбомаў. Па-другое, неадкладна «злётаць да канавы» па букеты. Каля яе да Паскі кожны год расцвітаюць зязюлькі і сон-трава — першыя веснавыя кветкі. Па-трэцяе, ёй жа яшчэ паспець разам з меншым братам «за пераезд» — да хроснай. Маці пазней наладуе ім кошык з крашанкамі, кулічом і іншымі прысмакамі і адправіць іх яе адведаць і павіншаваць са святам Вялікім днём — Паскай. Дарынка і ёй падорыць першы веснавы букецік. А хросная маці ў адказ таксама наладуе сваім хрэснікам кошык з гасцінцамі і сырод іх, акрамя крашанак і куліча, абавязкова будуць незвычайныя падарункі з горада, бо яна ж у іх працуе не абы-кім, а праваднiцай.

Вой, які ж слаўны дзень гэты Вялікдзень!

**Раіса ДЗЕЙКУН.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ДЗЕДАВЫ РЭЛІКВІІ

**Так ужо атрымалася, што свайго дзядулю я бачу толькі на канікулах. Ён жыве ў іншым горадзе, таму і наведваю яго не так часта, як хацелася б. Але нават нягледзячы на рэдкія сустрэчы, дзядуля ніколі не ўпусціць магчымасці па скайпе ці тэлефоне расказаць пра свае незвычайныя адкрыцці. Справа ў тым, што ён займаецца дэталёвым вывучэннем гісторыі роднай вёскі, гадзінамі праседжвае ў архівах і, як дзіця, цешыцца неспадзяваным вынаходкам.**

У вёсцы дзед не жыве ўжо даўно (з самога юнацтва пераехаў у горад). Але сувязь з роднай зямлёй настолькі трывалая, што і цяпер ён вяртаецца ў край дзяцінства. Шукае старыя дакументы, піша нататкі ў мясцовыя газеты пра слаўтых аднавяскоўцаў...

Гэтым разам дапамога скайпу нават не спатрэбілася — я завітала да дзядулі на выхадныя. І што вы думаеце, ён не траціў марна часу! Адразу выклаў на стол кіпу старых фотаздымкаў! Аказваецца, з часу нашай апошняй сустрэчы ён паспеў з'ездзіць у вёску, пагутарыць са старажыламі і знайсці шмат цікавага матэрыялу. «Ганне, з фронту... 1942 г.», — чытае дзед надпіс на адваротным баку фотакарткі і асцярожна перакладае яе ў асобную скрынку, дзе захоўваюцца ўсе яго рэліквіі. Іх, звязаных з гісторыяй роднай вёскі, мае сотні.



Я гляджу на шчаслівыя вочы роднага чалавека і разумею, што гэтыя пажоўклыя шматкі паперы — для яго велізарная каштоўнасць. Гэта памяць. Сувязь з тымі, хто з'яўляецца яго неад'емнай часткай.

Зараз дзед піша ўжо другі нарыс пра гісторыю роднага краю. І я ўпэўнена, што гэта толькі пачатак яго творчай дзейнасці, бо мы ўжо прыходзяць паведамленні ад людзей, якія цікавяцца яго даследаваннямі.

**Аляксандра КАМКО**

■

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

# «З 12 гадоў хлопчыка павінен выхоўваць тата»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Як перажыць страту блізкага чалавека? Можа, у вас ёсць нейкі рэцэпт?***

— Філасофскія адносіны да жыцця і смерці заключаюцца ў тым, што трэба ўсё ўспрымаць годна. Самае цяжкае — гэта было сказаць сыну, што мама памерла. Я сказаў, што яна проста перамясцілася ў іншую прастору, другое вымярэнне. Уладзік сказаў: «Я ведаю». Сыну было ўсяго 5 годзікаў, калі Жанне паставілі страшны дыягназ. Ён даглядаў маці, гэта ўсё прайшло на яго вачах. ...Я не маю права раскісаць, апускаць рукі! Які ж прыклад сыну пакажу?! Я абавязаны пра яго паклапаціцца за дваіх. Жанна мяне перад смерцю праінструктавала.

***— Думаю, што яшчэ пачуццё гумару вас выручае ў многіх сітуацыях?***

— Смяяцца трэба, з сябе ў тым ліку. Чалавеку ў жыцці наогул неабходна толькі дзве якасці: высокі прафесіяналізм і пачуццё гумару.

***— На вас у адзін момант столькі ўсяго звалілася. Як спраўляецеся, хтосьці дапамагае?***

— Спачатку сваякі дапамагалі, бабуля. З 12 ж гадоў, гэта не сакрэт, хлопчыка павінен выхоўваць тата. Уладзік, гэта ты прыйшоў? Ідзі сюды, у нас тут кансультацыя, ці лёгка цябе выхоўваць?

***— О, дык ты сапраўдны джэнтльмен! Пастаянна ходзіш у школу ў касцюме ды ў гальштуку-бабачцы?***

— А як жа ж! — каментуе маўклівы ківок галавой сына спадар Леанід. — Дрэс-код. Ён у гімназіі вучыцца. Гэтую бабачку, дарэчы, яму падарыў мой сябра, прафесар, таму яму прафесарам ужо няма сэнсу станавіцца *(смяецца)*. ...Добра, размовы размовамі, а мне сыну трэба перакусон пакласці *(кіруецца на кухню)*. Ён жа гадзінку тут пабудзе і пойдзе ў музыкалку.

***— Есці гатуеце самі ці наймаеце кагосьці? — цікаўлюся, пакуль Леанід Фёдаравіч перакладае з кантэйнера ў талерку «селядзец пад футрам».***

— Самі. Я адношуся негатыўна, калі нехта чужы ў доме з'яўляецца. Вокны трэба памыць *(кідае погляд на акно)*. Памыем, праўда Уладзік, не праблема? Прыбіраемся, пыласосім па чарзе. Сам гатую і сына вучу. Мы супы разам робім, беляшы, пірагі з тварагом ды з мясам. З вечара планую меню на наступны дзень. У мяне шмат паездак, замежных камандзіровак. Праўда, зараз да мінімуму звёў. Але трэба, каб Улад без мяне спраўляўся з усім. Мужчына павінен быць самастойны. Мы — такія. Канешне, дрэнна, што адны засталіся...

## «Які я вам дзядуля?..»

***— Спадар Леанід, вам было за 50, калі нарадзіўся Уладзік. Кажуць, познія дзеці працягваюць маладосць сваіх бацькоў...***

— Мы куплялі на днях туфлі Уладзіку ў краме. Прадавачкі да мяне звярталіся: «Дзядуля...». Я ўжо прывык, не крыўджуся, з гумарам стаўлюся. «Які я вам дзядуля? — кажу. — Не зайздросціце!» Дзеці — заўсёды шчасце. Позніх, ранніх. У той жа Пугачовай маленькія дзеці. А паглядзіце на нашага прэзідэнта... Час памяняўся. Памяняліся стандарты жыцця. Цяпер людзі сталі жыць на 20 гадоў больш. Дарэчы, Мендзялееў быў апошнім, сямнаццатым дзіцем. І праславіўся на ўвесь свет. Таму, мілыя жанчыны, звярніце ўвагу, ад каго трэба нараджаць дзяцей.

***— Чула, што вы вывелі формулу, якая дапамагае знайсці ідэальнага партнёра...***

— Гэта не я. Мне яе прафесар адзін падказаў: х (узрост мужчыны) трэба падзяліць на 2 і дадаць 7. У нас з Жаннай розніца ва ўзросце пад 20 гадоў. Мне было 50, а ёй — 33. Ідэальны варыянт. Я ўжо быў самастойны, і яна



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**«Гэты раяль для сына куплялі. Юрый Антонаў адпачываў бы, калі б у мяне быў такі ў дзяцінстве».**

Дзве цікавыя асобы. Што такое каханне? Гэта бескарыслівая, самазабыўная цяга да індывідуальнасці.

***— Як складваюцца адносіны паміж сынам і вашай старэйшай дачкой?***

— Цудоўна. Маёй дачцэ 40. У яе самой трое дзяцей. Паміж маім старэйшым унукам і Уладзікам розніца ўсяго адзін год. Кажу яму: давай да пляменнікаў з'ездзім *(смяецца)*. Яны яго заўсёды чакаюць.

***— Леанід Фёдаравіч, не было жадання адпачыць на пенсіі?***

— Якая пенсія! Калі я скажу некаму са сваіх замежных калег, што я пенсіянер, яны прытомнасць страцяць. Калі на цябе ёсць попыт, які ты пенсіянер? Ды і ў выкладчыка няма ўзросту. Ён альбо добры альбо дрэнны. На многіх людзей, якім па 30—40 гадоў, — няма попыту. Яны сабе не могуць знайсці працу... Гэта лёгка высветліць. Пасядзіце дома. За цэлы дзень ніхто не патэлефануе — значыць, вы нікому не патрэбны. У беларусаў наогул няма імкнення да канкурэнцыі.

***— Ды і на адну пенсію сына на ногі нерэальна паставіць...***

— Я сваім маладым калегам і знаёмым кажу, рабіце так, каб не жыць на пенсію. Альбо зарабляйце грошы раней, альбо памірайце раней. Зараз я ў асноўным выкладчыкам чытаю лекцыі, у тым ліку і за мяжой. Англійскую, французскую і нямецкую мовы засвоіў толькі пасля 30. Вучыцца трэба ўсё жыццё, незалежна ад узросту.

***— Да таго ж вы цудоўна іграеце на раялі...***

— І не толькі на раялі. Надакучыла пісаць — сеў пайграў. Як казалі ў савецкі час, гарманічная асоба. У студэнцкія часы мае аднагрупнікі падпрацоўвалі дворнікамі і вахцёрамі. А я іграў на вяселлях, у рэстаранах, працаваў у музычным аддзеле ўнівермага. Важна ўмець штосьці рабіць рукамі. У мяне ёсць план: летам выехаць у Вену і каля Венскай оперы пайграць на акардэоне. Зарплата будзе большай, чым у любога прафесара нашай кансерваторыі... Лішніх ведаў і ўменняў не бывае, як і лішніх грошай.

***— А што датычыцца эканомікі, чаго б яшчэ хацелі дасягнуць?***

— Хачу заснаваць унікальную школу і выкладаць там макраэканоміку для міністраў і дзяржаўных чыноўнікаў вышэйшага класа.

## «Не разумею, як гэта мужчына без грошай ходзіць»

У рабочым кабінеце Леаніда Заікі шмат месца займае доўгі драўляны стол.

— Мы разам з Уладзікам за ім змяшчаемся. Я працую. А ён урокі вучыць.

***— Гляджу, у вас на стале даволі шмат рэчаў...***

— Гэта Уладзіка, у асноўным. Я не ўмешваюся. Ведаю, што чужыя рэчы перакладаць нельга. Бо памятаю, калі быў малы, і мама не дай бог рабіла прыборку, то пасля капут — нічога не знойдзеш.

Побач з рабочым сталом — кніжная шафа на ўсю сцяну.

— Вось тут кніжкі, якія я напісаў. А вось гэтую — «Германская ваенная думка» — Улад купіў.

***— Ваш сын такія сур'ёзныя кнігі чытае?***

— Дык кніга цікавая! Я і сам яе з задавальненнем у яго бяру. Мы нават не можам падзяліць, хто яе першы будзе чытаць.

***— Вы даяце сыну грошы на кішэнныя расходы?***

— Уладзік можа пісаць у сваёй біяграфіі, што пачаў працаваць у два гады. Здымаўся ў рэкламе. Віселі па ўсім горадзе білборды. А цяпер я яму аформіў банкаўскую картку, ён ужо сам расплачваецца. Крыху пазней навучу яго, як ствараць фінансавыя патокі, як ацэньваць сітуацыю, рызыкі і іншае. А як жа! З грашыма трэба ўмець працаваць.

***— Хочаце, каб ён стаў таксама, як і вы, эканамістам?***

— Ні ў якім разе. Навошта? Паглядзіце, у Алы Пугачовай дачка спявачка. Гэта ж тупіковы кірунак, калі дзеці паўтараюць шлях бацькоў. У ГДР у свой час гэта нават забаранялася. Толькі дзве сферы дзейнасці былі недатыкальныя: медыцына і выкладанне ў ВНУ.

***— А калі яму захочацца?***

— Не, яму не хочацца. У яго нармальнае мысленне. У Беларусі выпускаецца ў год 5000 эканамістаў. Каго вы з іх ведаеце? Паглядзіце, насупраць будынак стаіць, там рыхтуюць менеджараў-маркетолагаў. Не ведаю, дзе мы знойдзем столькі прадпрыемстваў для гэтых менеджараў. Мне трэба было паправіць вентыль. Патэлефанаваў, каб выклікаць сантэхніка. Кажуць, толькі праз тры дні прыйдзе. Праблема — няма сантэхнікаў. Менеджараў сотні, а сантэхнікаў няма.

***— Я ў вас у доме налічыла ажно чатыры камп'ютары. Дазваляеце сыну карыстацца імі? Не раз чула насцярожанае: «Бяда цяпер, што дзеці сядзяць у гаджэтах...»***

— Які дурань сказаў, што гэта бяда? Што казалі настаўнікі, калі я быў школьнікам? Таварышы бацькі, будзьце пільныя: дзеці сядзяць увесь час каля тэлевізара. Я ўдзячны сваім маці і тату, што не забаранялі. Бо тэлевізар для мяне быў на той час акном у свет. Цяпер дзеці глядзяць тэлевізар? Не. Праблема вырашылася. Дзеці заўсёды выбіраюць самыя тэхнічныя, высокаінтэлектуальныя штучкі. Інтэрнэт дапамагае мне ў выхаванні сына. У нас неяк узнікла дыскусія, які рост быў у Пятра І. Усе пішуць, што пад два метры. Я пачытаў у спецыялістаў, аказваецца недзе 160 сантыметраў. Дзякуючы інтэрнэту мы хутка можам знайсці адказы на ўсе свае пытанні. Змагацца з гэтым не трэба. Адзінае — вочы. Ва ўсім трэба ведаць меру.

***— Вы разбіраецеся ў эканамічных працэсах. Як лічыце, хто павінен распараджацца сямейным бюджэтам — муж ці жонка?***

— Грошы павінны быць у кожнага. Гэта ж сусветная практыка. Завядзіце проста асобную картку на агульныя расходы, пакупку прадуктаў і скідвайце туды частку сваіх грошай. Я не разумею, як гэта мужчына без грошай ходзіць. Гэта ж не мужчына, а дадатак да жанчыны. Ды ён нават, калі і захоча, сюрпрыз сваёй жонцы не зможа зрабіць. Наогул наяўных грошай у нармальнага чалавека не павінна быць. Яны могуць быць толькі ў карупцыянераў і ў злачынцаў. Калі вы ў Амерыцы за касцюм будзеце плаціць 500 долараў гатоўкай, гэта выкліча ва ўсіх да вас крайні недавер. Таму ў мяне ўсе грошы на картках.

***— Калі я зараз у вас папрашу 60 капеек на метро, вы мне не дасце?***

— Не, раней пастаянна прасілі ў двары мужыкі. Цяпер не просяць, бо ведаюць, што ў мяне картка. Камунальная таксама аплачваю праз інтэрнэт. Гэта ж ганьба, калі я, вядомы эканаміст, буду на пошце з бабулькамі стаяць у чарзе.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

***— Шлях да сэрца мужчыны ляжыць...***

— Кажуць, што праз страўнік. Але гэта ўсё абы-што. Выключна праз інтэлект.

***— Дзяцей трэба песціць ці трымаць у строгасці?***

— Дзяцей трэба любіць. І стымуляваць, каб яны самі развіваліся. І менш кантраляваць. Яны павінны быць самастойнымі: і чым раней, тым лепш. Пакуль маладыя, яны павінны «укалваць», ездзіць, глядзець свет.

***— Ёсць чалавек, знаёмствам з якім вы ганарыцеся?***

— Сяброўствам з Алегам Сарокіным, цудоўны быў музыка. А таксама знаёмствам з сантэхнікам. На днях прыйшоў, зрабіў невялікую работу. Кажа: мне плаціць нічога не трэба. Лепш патэлефануйце ў дзіцячы хоспіс, там некалькі рублёў за званок з вашага тэлефона спішуць. Вось ён, сапраўдны чалавек. Ні адзін багаты і паспяховы мне такога не прапанаваў.

■ Свая справа

# У ГОСЦІ ДА ЛЯЛЬКІ

## Галіна Жамчужнікава пра рай для дзяцей і дарослых

**Каго там толькі няма! Красуні ў народных строях, чырвоныя алкаголікі, зморшчаныя, нібыта печаныя яблыкі, бабулі і дзядулі, Чарлі Чаплін, кампанія рыбакоў, міфічныя істоты, кацяняты... Нават дырэктар адной паспяховай арганізацыі сядзіць на велічным троне ў касцюме цара. А яшчэ там жывуць няшчасныя людзі-дзікуны. Вось што адбываецца, калі ў творцы ў дадатак да таленту ёсць яшчэ і пачуццё гумару.**



Галіна Жамчужнікава (у цэнтры) паказвае ляльку наведвальнікам сваёй выстаўкі.

### УБАЧЫЦЬ ЛЕС ЗА ДРЭВАМІ

Пераступаеш парог гродзенскай хаты Жамчужнікавых — раз! І кідаецца ў вочы падвешаная да супрацьлеглай сцяны Бабка Ёжка, страшная і смешная. Разумееш, куды патрапіў. Гэта не проста дом, а імперыя ўнікальных лялек. І гэта не проста сям'я, а творчы саюз, дзе ўсё падпарадкавана таленту гаспадыні. А вось і яна, наша гераіня. Галіна Жамчужнікава, зачароўвае адкрытым абліччам, чыстым, звонкім голасам.

«Гавораць, кожны лялечнік — гэта яго светласць плюшкін з галавы да ног. Праўду людзі кажуць?» — весела пытаю.

«Праўду! *(смяецца)* Ведаеце, камяні, пацерачкі, анучкі, кавалкі дрэва — усё просіцца, як у казцы пра царэўну-жабу: «Вазьмі мяне, я табе спатрэблюся». У лес нармальныя людзі ідуць у грыбы, ягады. Мы ж ненармальныя *(усміхаецца)*: цягнем поўныя кошыкі шышак, імхоў, карчоў. Ад сябровак прыношу выкінутае імі футра. Майстэрня нагадвае барахолку».



Баба Яга — гэта славянскі абярэг. Калі яна вісіць каля дзвярэй, то позіркам адганяе злыя чары, госця з камянём за пазухай.

**Колькі гадоў таму Галіна рабіла дзве лялькі адначасова. Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч з гітарай на юбілей артыста.**

Галіна Жамчужнікава прайшла доўгі шлях ад фермерства, уласнай крамы жаночай бялізны, дзе для творчага складніка не было ні месца, ні часу, ні сіл, да высокага мастацтва. Апошнія 5 гадоў гераіня жыве ў абдымках лялечнай справы, і райская птушка поспеху, аднойчы зазірнуўшы ў яе вокны, вырашыла далёка не адлятаць.

Ці то прачнулася генетычная памяць, ці то мінула эра захаплення галівудскімі штампамі, але лялька Барбі па-за модай у кампаніі гламуру і мішуры. Народ убачыў лес за дрэвамі, ацаніў душу, характар, яго вабіць роднае, і гарыць зялёнае святло для лялек з тканіны і вылепленых з палімернай гліны. Так, аўтарская лялька ва ўсіх сваіх іпастасях перажывае Рэнесанс.

Айчынны рынак багаты на матэрыялы для лепкі аўтарскай лялькі: палімерная гліна, пластык, пластылін, паперклей. Валасы замяніць пража, авечая поўсць, якую можна расчэсваць, завіваць, заплятаць, фарбаваць, як душа просіць. Касмічных грошай не трэба, і бабуліну шафу таксама яшчэ ніхто не адмяняў.

### КУПАЛІНКА З ЛЮДОВІКАМ XIV

Любіць Галіна Жамчужнікава народны касцюм, асабліва беларускі. Вылепленых з палімернай гліны нашых родных Паўлінак яна апранае ў ільняныя сукенкі. Дэкальтэ імправізаваных красунь упрыгожвае старадаўнімі грыўнамі, плечы — фібуламі. Сучаснае гучанне яна надае з дапамогай вышыўкі бісерам. Часта лялькі-беларусачкі Галіны Жамчужнікавай — дакладныя адпаведнікі эпохі, арнаменты гавораць пра Гродзенскую ці якую-небудзь іншую вобласць.

«Інстытут замаўляў Купалінку. Дзяўчынка атрымалася прыгажуняй, хоць вельмі я не люблю прыгожых *(смяецца)*. Душа млее ад зморшчаных, нібыта печаных на сонцы яблыкі, бабуляў, дзядуляў і, канешне, горкіх п'яніцаў-алкаголікаў. Любая харызматычная асоба, рукі якой выдаюць прафесію, перажыты вопыт, а твар красамоўна маўчыць, — гэта і ёсць мая будучая лялька», — дзеліцца творца.

Яркія, феерычныя вобразы паляўнічых, лётчыкаў, касманаўтаў мяжуюць з копіямі смешных карапузаў, Людовіка XIV і Чарлі Чапліна. У час цывілізацый спажыўцоў, калі чалавек бачыў усё, і грушамі на вярбе яго не здзівіш, Галіна Жамчужнікава здзіўляе. Аднойчы супрацоўнікі паспяховай арганізацыі звярнуліся з ідэяй. У кіраўніка юбілей. Што падарыць немаладому мужчыну, у якога ёсць усё? Нам, калі ласка, ляльку нашага любімага дырэктара ў касцюме цара і абавязкова на велічным троне. Было многа замоў на ляльку-копію пэўнага чалавека да гэтай і будзе яшчэ больш пасля. Але некаторыя адзначаны пачуццём гумару, якое так цэніць Галіна, або выключнасцю самой асобы. Колькі гадоў таму яна рабіла дзве лялькі адначасова. Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч з гітарай на юбілей артыста.

### ВАЛДАЙСКІ ЗВАНОЧАК ДЫ МУЖ, ЯКІ СТРЫМАЎ АБЯЦАННЕ

Акіянічную цеплыню выпраменьваюць народная лялька-памочніца, лялька-траўніца, дарожны валдайскі званочак. «Памочніца — мая ўлюбёная народная лялька, — кажа гаспадыня. — Яе дарылі смігадовай дзяўчынцы. Гэта лялька пэўнай велічыні, каб дзіця вучылася гатаваць: вады наліваць па макушку, крупы сыпаць па шыйку». Унутры траўніцы зашываліся духмяныя зёлкі. Дарожны валдайскі званочак рабілі без твару, галоўнае — прымацаваны вузельчык з роднай зямлёй, каб памятаць на чужыне свае карані.

У Беларусь Галіна Жамчужнікава і сама магла б смела ехаць з валдайскім званочкам. Родам з Урала, яна па сутнасці касмапаліт. Доўга жыла ў Казахстане. Пашкадаваць, што паехала за мужам-беларусам у Гродна, лялечніцы не давялося. «Барыс паабяцаў зрабіць мне майстэрню ў самым сэрцы горада. Абяцанне як былы вайсковец, ён стрымаў, аддаўшы маім лялькам вялікі пакой».

**У лес нармальныя людзі ідуць у грыбы, ягады. Мы ж ненармальныя (усміхаецца): цягнем поўныя кошыкі шышак, імхоў, карчоў.**

...А ад вас у дзяцінстве хавалі нажніцы? Калі так, то вы зразумееце, чаму першыя ў Гродне курсы па палімернай гліне прайшлі на ўра. «Я не чакала, што стольких людзей зацікавяць лялькі. Праўда, пасля выявілася: усе яны такія ж хворыя на галаву, як і я *(смяецца)*, таму з імі было прыемна размаўляць. Звярнуліся жанчыны сярэдняга ўзросту. Яны маюць работу, сям'ю, унукаў, хатні дабрабыт. Гэта нармальныя людзі. Знешне, — зноў жартуе лялечніца. — Старэйшая вучаніца даўно размяняла восьмы дзясятак, тады як малодшай — 18. Многія крычалі: «Я не ўмею шыць! Я не ўмею маляваць!» Сёння вучаніцы ладзяць свае ўласныя выставы на радасць Галіне Жамчужнікавай. «Я ганаруся імі. Малайчынкі, робяць лялькі не горш за мяне, і самае галоўнае — шчаслівыя! А па гэта яны і прыходзілі. Чагосьці ў жыцці не хапала тады, калі, здавалася, што ўсё ёсць».

На пачэсным месцы ў хаце гаспадыню радуе лялька «Сын за камп'ютарам». Ён даўно вырас і жыве ў Петразаводску, а яго маленькая копія спынілася ў часе і засталася з матуляй. Далёкі ад мастацтва, сын Галіны, як чалавек з пачуццём гумару, не можа не любіць насатых жыхароў майстэрні. Але галоўны шанавальнік творчасці не ён.

«І шанавальнік, і крытык — мой муж. Адзінаццаць гадоў разам. І гэта ён калісьці сказаў: «Рабі лялькі». Залатыя чалавек са спартанскай мужнасцю. Барыс займаецца выстаўкамі, сайтам, перакладамі, калі лялькі адпраўляюцца ў Еўропу, Расію, разыходзяцца па Беларусі. Ён і каву прынясе на падносе, і шкарпэткі ўмее прасаваць сам. Цаню яго за каханне, цяпло», — зязюць, бы зоры, вочы нашай гераіні.

«Ведаеце, мне гавораць: «Хітрая ты! Усе думаюць, што мастацтвам займаешся, а сама ў лялькі гуляеш», — ужо на парозе таямніча скажа Галіна і мы ўсміхнёмся пад падабрэлым позіркам Бабы Ягі. Відаць, лялечніца не губляе сувязі з крылатымі арэлямі і часта наведвае краіну дзяцінства, а таму такая маладая і знешне, і ў душы.

**Маргарыта САДОЎСКАЯ**




# Дзе жывуць тапір і калібры,

## або Гуляем з карысцю

**Пасля выхаду ў мінулым нумары «Сямейнай газеты» матэрыяла «Пагуляй са мною, тата» на сайце «Звязды» з'явілася некалькі цікавых каментарыяў. «У мяне ў самога малое так часам канькае, — піша Тарас. — Нават раздрукаваў гэты артыкул як інструкцыю для дзеянняў. Мне здаецца, што ў вашага шматдзетнага таты шмат чаго з гульняў у загашніку ёсць. Можа, ён на сайце на гэту тэму працяг зробіць? Буду чакаць».**

Пакуль наш шматдзетны і дасведчаны тата Сяргей Куркач дастае з загашніка гульні, Алена Д. дзеліцца сваімі падказкамі: «Майму малодшаму 4, і вось у што гуляем мы. **Геаграфія.** Мы чытаем казкі, а пасля шукаем на карце мясціны, дзе жывуць іх героі. Напрыклад, апошняй прачытанай была кніжка Алены Масла «Мяне завуць Лахнэска». Мы знайшлі на карце Беларусь, дзе жыў Апалонік, Вялікабрытанію і нават возера Лох-Нес (адкуль прыбыла Лахнеска), Грэцыю (з якой звязана імя Апалон). Таксама пагледзелі, якія сцягі ў гэтых краін, сталіцы. А яшчэ ў нас ёсць цудоўны атлас для маленькіх дзетак, куды трэба размяшчаць налепкі з жывёламі, раслінамі, цудоўнымі мясцінамі розных краін. Я шукаю інфармацыю ў інтэрнэце, а таксама мы набіраем розных кніг у бібліятэках, і дзе сваімі словамі, дзе «кніжнымі» перадаю інфармацыю малому. Пасля мы на вялікай карце шукаем, дзе ўсё гэта знаходзіцца. У чатыры гады мой малы можа паказаць, дзе растуць рафлезія і секвоя, дзе жывуць даўгапят, тапір і калібры, і многае іншае. **Англійская мова.** Мы таксама дакранаемся да частак цела, твару, але пры гэтым я спяваю калыханку на англійскай мове. Робім зарадку пад англійскія песенькі. А яшчэ дзіцяці падабаецца выконваць каманды, што ён зноў жа атрымлівае на замежнай мове (накшталт, «ран», «джамп», «сліп»). Мы дастаём нашы цацкі і глядзім, якая жывёла (іх назвы гаворым толькі на англійскай мове), што ўмее рабіць. **Гісторыя.** Праглядаем розныя энцыклапедыі. Знаёмімся з гісторыяй, а пасля гуляем у яе паўсоль — у час купання адкрываем Амерыку, у пясочніцы робім егіпецкія пірамідыі ямы для палявання на мамантa, на вуліцы мы — індзейцы і каўбоі. А сёння збіраемся рабіць егіпецкую мумію — будзем замотваць ляльку туалетнай паперай. **Тэатр.** Чытаць казкі на розныя галасы — гэта было забавай майго малога ў 1,5 года. Яму сапраўды вельмі падабалася, калі ў «Церамку» воўк, жабка і іншыя гаварылі незвычайнымі галасамі. У такім жа ўзросце дзіця само любіла ўключацца ў якасці героя казак. Паказвала, як плачуць дзед і бабка над разбітым яйкам і як квохча Курка-Рабка, альбо разводзіла рукі і паказвала, што героі не могуць выцягнуць рэпку. А ў 4 гады дзеці ўжо самі прыдумляюць казкі, ці перарабляюць іх на новы лад, альбо аб'ядноўваюць герояў з розных казак і глядзяць, што з гэтага атрымаецца... **Беларуская мова.** Беларусь мы вывучаем «на натуры» — ходзім, ездзім у музеі, паркі. Бярэзінскі запаведнік і Нясвіж — святая справа. Слухаем дыскі з беларускімі паданнямі і казкамі, чытаем кніжкі на роднай мове. Мой малы ведае, хто такія злыдні, баламуцень, бялун, жыцень і іншыя. (Адна з яго любімых кніжак «Чароўны свет» — якраз пра розных беларускіх міфічных істот.) На жаль, беларускасці не хапае не толькі ў садках, але нават у беларускамоўных школах. Так што, таты, наперад, бо нам адным без вас з гэтай праблемай не разабрацца. Як добра, што вы, свядомыя, ёсць у дзетак. Бо зараз многім сынам і дочкам сваіх бацькаў вельмі не хапае. На жаль, замест сумесных гульняў часцей бывае такое: «папа есть и папы нет — папа вышел в интернет».

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 31 декабря 2016 года

| | |
|---|---|
| **Организация** | **ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»** |
| **Учетный номер плательщика** | 100896485 |
| **Вид экономической деятельности** | строительство |
| **Организационно-правовая форма** | частная |
| **Орган управления** | без ведомственной подчиненности |
| **Единица измерения** | тыс. руб. |
| **Адрес** | г. Минск, ул. К. Маркса, 25 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 8 991 | 4 830 |
| Нематериальные активы | 120 | - | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 5 044 | 27 726 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | - | - |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **14 035** | **32 556** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 10 851 | 4 735 |
| в том числе: материалы | 211 | 643 | 430 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 51 | 295 |
| готовая продукция и товары | 214 | 10 157 | 4 010 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 404 | 1 358 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 2 | 8 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 1 096 | 712 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - | - |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 13 | 1 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **12 366** | **6 814** |
| **БАЛАНС** | **300** | **26 401** | **39 370** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 1 | 1 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | 2 089 | 2 089 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 13 957 | 11 114 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **16 047** | **13 204** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 6 275 | 21 926 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **6 275** | **21 926** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 41 | 300 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | - | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 4 024 | 3 940 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 974 | 1 145 |
| по авансам полученным | 632 | 45 | 303 |
| по налогам и сборам | 633 | 16 | 205 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 44 | 21 |
| по оплате труда | 635 | 126 | 88 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | 398 | 508 |
| прочим кредиторам | 638 | 2 421 | 1 670 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 14 | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **4 079** | **4 240** |
| **БАЛАНС** | **700** | **26 401** | **39 370** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

за январь–декабрь 2016 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 года | За январь – декабрь 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 29 319 | 15 645 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (17 648) | (11 464) |
| Валовая прибыль | 030 | 11 671 | 4 181 |
| Управленческие расходы | 040 | (740) | (920) |
| Расходы на реализацию | 050 | (48) | (24) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 10 883 | 3 237 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 237 | 446 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1 926) | (829) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 9 194 | 2 854 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 229 | 16 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 216 | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 11 | 16 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 2 | - |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (4 327) | - |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (39) | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (4 288) | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 3 | 11 648 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | - | - |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | 3 | 11 648 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 557) | (8 423) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (1 555) | (68) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | - | - |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (2) | (8 355) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (5 652) | 3 241 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 3 542 | 6 095 |
| Налог на прибыль | 160 | (696) | (1 159) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 2 846 | 4 936 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 2 846 | 4 936 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ

Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро»
**за период с 01.01.2016 г. по 31.12.2016 г.**
Руководитель **ЗАО «Топзапэлектро» Новиков Д.В.**
***Аудируемое лицо: Закрытое акционерное общество «Топзапэлектро»***
**220030, г. Минск, ул. К. Маркса. 25-1**
Свидетельство о государственной регистрации **№100896485**
от 14 сентября 2000 г., УНП 100896485
ОДО«АудитСтрой»
**220004, г. Минск, пр. Победителей. 5-51, телефон (8-017) 328-20-22**
Свидетельство о государственной регистрации **№190131002**
от 8 августа 2000 г., **УНП 190131002**

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «Топзапэлектро», состоящий из: бухгалтерского баланса (на 31 декабря 2016 г.), отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности.

**ОБЯЗАННОСТИ РУКОВОДСТВА АУДИРУЕМОГО ЛИЦА ПО ПОДГОТОВКЕ БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ**

Руководство ЗАО «Топзапэлектро» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

**ОБЯЗАННОСТИ АУДИТОРСКОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской отчетности и соответствии совершенных ЗАО «Топзапэлектро» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности ЗАО «Топзапэлектро», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ЗАО «Топзапэлектро», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности ЗАО «Топзапэлектро».

**Основания для выражения аудиторского мнения с оговоркой**

Мы не смогли присутствовать при проведении инвентаризации товарно-материальных ценностей и не смогли проверить количество товарно-материальных ценностей посредством альтернативных аудиторских процедур.

**АУДИТОРСКОЕ МНЕНИЕ С ОГОВОРКОЙ**

По нашему мнению, за исключением возможного влияния на бухгалтерскую (финансовую) отчетность обстоятельств, изложенных в разделе «Основания для выражения аудиторского мнения с оговоркой», бухгалтерская отчетность ЗАО «Топзапэлектро» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗАО «Топзапэлектро» на 31 декабря 2016 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения ЗАО «Топзапэлектро» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

Руководитель аудиторской организации:
Директор ОДО «АудитСтрой» Арещенко А. В.
Аудитор, возглавлявший или проводивший аудит Аудитор Бородина Г. А.
Дата подписания аудиторского заключения – «13» февраля 2017 г.

## Извещение о проведении 27 апреля 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м; теплосети (инв. №01-178); электросети (инв. №01-169); сети водопровода (инв. №01-170) | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 159 748,32 | 100 000,00 |
| 2 | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 11 791,17 | 1 100,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.

**Организатор торгов:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС.

В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 27 апреля 2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.04.2017 по 26.04.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017) 200-99-78, (029) 350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

## Извещение о проведении повторных аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)** |
| | **лот №1** |
| | по ул. Менжинского, 22 в г. Бресте на земельном участке площадью 0,0620 га |
| **Функциональное назначение земельного участка** | строительство административно-офисного здания |
| **Вещное право предоставляемого земельного участка** | **в аренду сроком на 5 лет** |
| **Объекты недвижимости, подлежащие сносу** | объекты недвижимости граждан и КУП «ЖРЭУ г. Бреста» |
| **Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке. Объекты расположены в районах с развитой инженерной инфраструктурой** | |
| **Начальная цена продажи (руб.)** | **12 758,68** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 2 550,0 |
| **Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)** | **3 839,8** |
| **Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям, (руб.)** | **8 987,99** *(на 30.09.2016 г.)* |
| **Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** | |

**Условия продажи:**
Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 5 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:
- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;
- в срок, не превышающий одного года со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с городского бюджета будут внесены суммы платежей, отраженных в протоколе о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размерах, определенных соответствующим протоколом аукционных торгов в счет оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке) победителем аукциона – в размере цены продажи, сформированной по результатам аукциона, а единственным участником – в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, и компенсации расходов, понесенных городским бюджетом, по подготовке земельно-кадастровой документации, архитектурно-планировочного задания и технических условий на размещение объекта, а также возмещения организатору аукциона суммы затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которой определяется до аукциона и фиксируется в соответствующей ведомости ознакомления участников);
- до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, подписания договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), а также договора аренды земельного участка будут выполнены условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:
- заключить договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений после совершения оплаты соответствующих сумм, но не позднее двух рабочих дней;
- в течение шести месяцев со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него приступить к занятию участка в соответствии с указанной целью и условиями его предоставления.

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462, и состоится при наличии не менее двух участников.** В аукционе могут участвовать юридические лица и индивидуальные предприниматели.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем –** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранным юридическим лицом –** копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык**; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) –** доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

**Задаток перечисляется в КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с 3012780360011 в филиале №100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

**Аукцион состоится 18 мая 2017 г. в 11.00 по адресу:**
**г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607 (либо актовый зал)**
**Заявки на участие в аукционе принимаются**
**с 8.30 13.04.2017 г. до 17.30 12.05.2017 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу:**
**г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2016 г.

| | |
|---|---|
| Организация | **ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»** |
| Учетный номер плательщика | 100364117 |
| Вид экономической деятельности | строительно-монтажные работы |
| Организационно-правовая форма | частная |
| Орган управления | ГПО Белтопгаз |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220123, г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 6 525 | 6 191 |
| Нематериальные активы | 120 | 6 | 5 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | | 21 |
| В том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | | 21 |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | – |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | | – |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | | 2 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 183 | 22 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 139 | 139 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | | |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | | – |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **6 853** | **6 380** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 19 080 | 5 022 |
| В том числе: материалы | 211 | 8 389 | 3 877 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | | |
| незавершенное производство | 213 | 10 691 | 1 145 |
| готовая продукция и товары | 214 | | |
| товары отгруженные | 215 | | – |
| прочие запасы | 216 | | – |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | | – |
| Расходы будущих периодов | 230 | 30 | 56 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 55 | 492 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 20 530 | 29 692 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 2 284 | 195 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 | 212 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 47 | 109 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **42 033** | **35 778** |
| **БАЛАНС** | **300** | **48 886** | **42 158** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 900 | 900 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | | – |
| Резервный капитал | 440 | 153 | 153 |
| Добавочный капитал | 450 | 5 075 | 5 082 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 189 | 156 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | | |
| Целевое финансирование | 480 | | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **6 317** | **6 291** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
